**С. В.Тарасаў**

# ЧАРАДЗЕЙ СЁМАГА ВЕКУ ТРАЯНА

*Усяслаў Полацкі*

Мінск
«Навука і тэхніка»
1991

В занимательной форме повествуется об одном из самых знаменитых белорусских князей — Всеславе Брячиславиче (1044—1101), который, по существу, был основателем белорусской государственности. Для современников он был человеком-загадкой. Окутанная легендами и преданиями, судьба Всеслава в значительной мере остается загадкой и для нас.

Адресуется широкому кругу читателей.

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук Г. В. Штыхаў
Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук М. А. Ткачоў,
кандыдат гістарычных навук Г. М. Сагановіч

На франтыспісе — партрэт Усяслава Чарадзея. Малюнак Я. Драздовіча. Са збораў былога Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні.

Тарасаў С. В.

Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі.— Мн.: Навука і тэхніка, 1991.— 67 с., [9] л. іл., партр.— (Нашы славутыя землякі).

ISBN 5-343-00878-X.

Тарасов С. В. Волшебник седьмого века Трояна: Всеслав Полоцкий.

У кнізе апавядаецца пра аднаго з самых славутых беларускіх князёў — Усяслава Брачыславіча (1044-1101), які быў, па сутнасці, заснавальнікам беларускай дзяржаўнасці.

Для шырокага кола чытачоў.

© С. В. Тарасаў, 1991

ISBN 5-343-00878-X

# ДА ЧЫТАЧА

Паміж намі, сённяшнімі, і тымі далёкімі, прыхаванымі смугою сівой даўніны продкамі пралягло дзевяць стагоддзяў. У недалёкай будучыні, калі мы пераступім мяжу XXI стагоддзя, гэтая бездань гісторыі будзе лічыцца ўжо на тысячагоддзі. Як спазнаць яе, як зазірнуць у яе прывабную глыбіню?

А з другога боку, навошта гэта трэба? Адна справа, калі вучоныя корпаюцца ў архівах, пераварочваюць горы зямлі археолагі,— яны займаюцца навукай, даследуюць гісторыю, пішуць кнігі. Часам гэтыя кнігі ставяцца на далёкія бібліятэчныя паліцы, і да іх рэдка звяртаюцца.

Дык дзеля чаго бярэмся мы гартаць старыя, пашарпаныя, даўно забытыя старонкі гісторыі? На гэтае пытанне маем безліч адказаў, і ўсе яны ўкладваюцца прыблізна ў наступную схему: гісторыя — памяць, памяць — жыццё, жыццё — будучыня паасобку ўзятага чалавека і ўсяго чалавецтва. Хто ж здолее адмовіцца ад сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей? Толькі нелюдзь. Вось мы і зазірнем у гістарычны нябыт, каб ведаць мінулае дзеля будучыні. Але ёсць яшчэ адна мэта, якая для нас, сённяшніх беларусаў, бадай найважнейшая: зразумець, нарэшце, сваё месца на зямлі, зразумець і вярнуць сабе багатую гістарычную спадчыну. Не проста «людзьмі звацца», а быць роўнымі сярод роўных, быць народам і ганарыцца гэтым. Вы запытаецеся: якое дачыненне мае да гэтага дзевяцьсотгадовая гісторыя? Самае непасрэднае.

Гісторыя нашага народа пачынаецца не з 1917 года і нават не з XIV стагоддзя, як некаторым хацелася б і нават зараз хочацца. Гісторыя народа зарадзілася на тых бязмежных прасторах Еўропы, заселеных балцкімі плямёнамі, куды ў VII-VIII стагоддзях нашае эры прыйшлі вялікія масы славян. Недзе там, у ваенных сутычках і прыродных катаклізмах, у непралазным гушчары, «паміж пустак, балот» нечакана і сустрэліся Ён і Яна. Сустрэліся і не спалохаліся. Хто з іх быў балтам, хто славянінам — зараз не істотна. Але зямля ў іх была адна, неба было адно, лясы, рэкі і азёры — усё было адзіным. Акрамя двух розных палымяных сэрцаў у грудзях. Але і яны не вытрымалі, зліліся ў адно. Колькі мінула стагоддзяў, колькі яшчэ міне, але гэтае сэрца, калісьці малое і кволае, стала магутным і вольным. І пакуль яно жыве і б'ецца, будзе жыць народ, будзе жыць Беларусь!

Шлях нашага народа быў няпросты. І пазначаны не толькі славутымі падзеямі, але і славутымі асобамі, якія ў тым ці іншым

перыядзе гісторыі станавіліся яго сімваламі. Адным з такіх сімвалаў, чалавекам-паданнем стаў Усяслаў Брачыславіч, Усяслаў Чарадзей.

Усяслаў быў адным з тых першых князёў, пры якім Полацкая зямля заявіла пра сябе як пра самастойную дзяржаву. Ён быў адным з першых ва ўсёй Усходняй Еўропе, хто адчуў перспектыўнасць і гістарычную неабходнасць развіцця адносна малых незалежных дзяржаў. Пры Усяславе высокага росквіту дасягнулі мастацтва, адукацыя, дойлідства. Хрысціянства пачало паступова, мірна ўжывацца ў штодзённы побыт народа. Пашыраюцца гарады, рамёствы, гандаль. Ён умацоўвае межы свайго княства-дзяржавы, але не забывае пра надзённыя патрэбы розных народаў, насельнікаў гэтай дзяржавы,— крывічоў, дрыгавічоў, балтаў, вугра-фінаў. Пра полацкага князя хадзілі чуткі, паданні, быліны, пісаў аб ім аўтар «Слова пра паход Ігараў».

Зразумела, не ўсё ў жыцці Усяслава Полацкага было бездакорным, бо жыў ён у супярэчлівы і гераічны час. Гэта не магло не адбіцца і на яго лёсе. Увесь характар князя быў, як змотак пераблытаных нітак. У ім пераплялося і белае, і чорнае. Нават такія фарбы, якія у прынцыпе несумяшчальныя, зліліся ў адзін колер. Ён памыляўся, кідаўся ў крайнасці, часам траціў веру, пачуццё меры, здраджваў адной рэлігіі ў імя другой і, наадварот, губляўся, нямеў ад бяссілля. Усё было ў яго жыцці. Але ніколі Усяслаў не здраджваў сваёй радзіме — Полацкай зямлі, да яе вяртаўся з самых далёкіх паходаў і вандровак.

Дык чым жа з'яўляецца сёння для нас тая далёкая пасівелая гісторыя? Гэта — наша спадчына, самае блізкае і дарагое, што можа быць у чалавека, як бацька і маці, якіх не выбіраюць. І якімі б яны ні былі, дзеці павінны іх шанаваць.

Дык пройдзем, дарагі чытач, пакручастымі вулачкамі старажытнага Полацка, адгорнем у кнігасховішчы старадаўняй бажніцы пабляклыя старонкі летапісу, паслухаем баладу пра Волха Усяславіча, якую праспявае нам вешчы Баян. Мы не першыя з табою, хто пачынаў ісці гэтым шляхам. Але і дайшлі не ўсе...

## НАРОДЖАНЫ АД ЧАРАДЗЕЙСТВА

*На неўзаранай зямлі збожжа не буяе * Рагвалодавы карані * Бацькоўскія крылы * Дзе родны край і дзе чужынскі? * Пад сонцам ласкавым на неспакойнай зямлі * Жыццё пачынаецца з першага кроку*

Лёс чалавека вызначаецца задоўга да яго нараджэння. Гэтае меркаванне можа быць прынятае цалкам як слушнае ў дачыненні да полацкага Усяслава. Бо асоба ў гісторыі — гэта толькі надводная частка вялікага айсберга, што ўзвышаецца над водамі гістарычнага мора. Гэтак і лёс Чарадзея стаў вынікам шматвекавога развіцця паўночна-заходніх земляў Усходняй Еўропы амаль з таго імгнення, як трапілі яны ў рэчышча агульначалавечай гісторыі.

Упершыню жыхары Полаччыны прыгадваюцца ў недатаванай частцы «Аповесці мінулых часоў»: «Пры гэтых братах пачаў трымаць род іх княжэнне ў палях, а ў дрэўлях сваё, а дрыгавічы сваё, а Славені сваё ў Ноўгарадзе, а другое на Палаце, што палачане. Ад іх жа крывічы...»[1]. Адбываліся гэтыя падзеі ў часы славутых князёў: Кія, Шчэка, Харыва і сястры іх Лебедзі прыблізна каля VII-VIII стагоддзяў. Славяне былі прышэльцамі. Яны аселі на землях, якія раней займалі скіфа-сармацкія, вугра-фінскія і балцкія плямёны. На неабсяжных прасторах, паміж палёў і лясоў, яны пачалі ставіць невялікія ўмацаваныя дзядзінцы-гарадзішчы, засноўваць вёскі-паселішчы. А часам проста сяліцца там, дзе жылі іх папярэднікі. Калі — разам, калі — побач, а калі — выгнаўшы карэнных жыхароў. Як бы там ні было, але ўжо ў IX стагоддзі летапісец называе ўмацаваныя паселішчы славян «гарадамі»: «І прыняў уладу Рурык, і раздаў мужам сваім грады: таму Полцеск, таму Растоў, другому — Белавозера. А па тых гарадах суць находнікі варагі, а першыя насельнікі ў Ноўгарадзе Славені, у Полацку крывічы...» Так упершыню пад 862 годам прыгадваецца ў летапісе Полацк.

Полацкая князеўская дынастыя на працягу сваёй 400-гадовай гісторыі мела два назовы — Рагвалодавічы і Усяславічы. Рагвалодавічамі князі называліся ў асноўным у X-XI стагоддзях. Усяславічамі — у XII-XIII стагоддзях. Гэта не дзіўна, бо Усяслаў Брачыславіч, як і яго прадзед Рагвалод, былі самыя вядомыя з усёй дынастыі. Рагвалод — першы полацкі князь, які прыгадваецца ў летапісных крыніцах пад

---

[1] Повесть временных лет // Повести Древней Руси. Л., 1983. С. 27.

980 годам, а паводле меркавання некаторых гісторыкаў — пад 970 годам[1]. Нягледзячы на пэўнае сведчанне летапісу, што Рагвалод «прыйшоў з-за мора», г. зн. што ён — вараг[2], сярод вучоных няма адзінства ў поглядах наконт яго нарманскага паходжання. Тлумачыцца гэта толькі тым, што на працягу колькіх дзесяцігоддзяў, патураючы ідэалагічным устаноўкам, афіцыйныя гісторыкі не адважваліся на глыбокі аналіз «нарманскага пытання». Лічылася ледзь не злачынствам падтрымліваць летапісную версію аб прызванні варагаў на славянскія землі. На гэтай падставе адмаўлялася відавочнае, нават нарманскія імёны саміх князёў.

Так, акадэмік Б. Рыбакоў узяўся растлумачыць імя Рагвалод славянскім словазлучэннем «валадар рога». На яго думку, валоданне рогам для пітва было безумоўнай прыналежнасцю да княжацкай улады. Але чамусьці спроба наварочвання нарманскіх імёнаў на славянскі лад гэтым і скончылася. Імёны Рурык, Алег, Рагнедзь не паддаліся тлумачэнню. Мала таго, узнікла законнае пытанне: як растлумачыць славянскай этымалогіяй назву аднаго з раёнаў-фюлькаў, які існаваў на поўначы Нарвегіі ў X стагоддзі і называўся Рогаланд?![3] Там, на поўначы Нарвегіі, славян ані блізка не было. Наадварот, амаль аднолькавае гучанне «Рогаланд» і «Рагвалод» дазваляе меркаваць, што менавіта з поўначы Нарвегіі і прыплыў са сваёй дружынай князь Рагвалод у Полацк.

Лёс Рагвалода і яго княства быў незайздросны, трагічны. І гэта сталася адной з прычын варожасці полацкіх і кіеўскіх князёў.

Прыгожую дачку Рагвалода — князёўну Рагнеду — упадабалі два князі: кіеўскі Яраполк і наўгародскі Уладзімір. Рагнеда дала згоду выйсці замуж за першага. Зняважаны Уладзімір збірае войска і ідзе на Полацк. Горад узяты прыступам і спалены, бацькі Рагнеды забітыя, а сама князёўна прымусам стала адной з жонак Уладзіміра.

Аднае начы ганарлівая палачанка зрабіла замах на жыццё Уладзіміра, на той час вялікага князя кіеўскага. Але няўдала. Яе чакала смерць. Выратаваў маці малалетні сын Ізяслаў, які, ледзь трымаючы ў руках меч, паўстаў паміж маці і раз'юшаным бацькам[4]. Па парадзе баяраў Рагнеда з сынамі Ізяславам і Яраславам (будучы Яраслаў Мудры) была высланая на Полаччыну.

---

[1] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 70—71.

[2] Варагамі (нарманамі, вікінгамі, «людзьмі з фіёрдаў») называлі насельнікаў Скандынавіі ў 700-1100 гадах. Яны часта рабілі набегі на прыбярэжныя зоны Заходняй і Усходняй Еўропы. Нарманы Карлсефні і Лейв Эрыксан з сябрамі былі першымі еўрапейцамі, хто пабачыў Паўночнаамерыканскі кантынент і заснаваў там паселішча ў X стагоддзі. Гандлёвым шляхам ад Нёмана да Дняпра і далей да Чорнага мора актыўна карысталіся шведскія варагі.

[3] Мельникова Е. А. Древнескандинавские географические сочинения. М., 1986. С. 166—169.

[4] Тверская летопись // Полное собрание русских летописей. СПб., 1863. Т. 15. С. 143.

Летапісец амаль праз стагоддзе змог ацаніць гэтыя падзеі, напісаўшы: «З тых часоў падымаюць меч Рагвалодавы ўнукі супроць унукаў Яраслава».

Разам з вяртаннем Рагнеды ў Полацкую зямлю аднавілася і мясцовая князеўская дынастыя. Ізяслаў стаў другім пасля Рагвалода полацкім князем.

Сын Ізяслава Брачыслаў пачаў працу па адраджэнні былой моцы і славы Полацкай зямлі. Пасля смерці Уладзіміра Хрысціцеля ў 1015 годзе ўся «шматковая і нетрывалая імперыя Рурыкавічаў была падзеленая»[1] паміж яго нашчадкамі. Сярод іх найбольш магутнымі былі Яраслаў Наўгародскі, Мсціслаў Тмутараканскі і Брачыслаў Полацкі. Ёсць падставы меркаваць, што гэты трыумвірат, а пасля смерці Мсціслава — двуумвірат, праз сваіх намеснікаў кіраваў у Кіеве. Раўнавага парушылася, калі Яраслаў па смерці многіх братоў перабраўся княжыць у Кіеў. Запярэчыць яму змог толькі адзін полацкі князь.

Паміж полацкім і кіеўскім войскам адбылася бітва, аб якой прыгадвае «Сага аб Эйдмундзе»[2]. Пасля яе быў заключаны мір, і да Полацка адышлі гарады Віцебск і Усьвяты[3].

Апынуўшыся паўнаўладным кіеўскім валадаром, Яраслаў не толькі будаваў горад, Сафійскі сабор, усяляк развіваў навуку, культуру, на што любяць зважаць амаль усе даследчыкі мінуўшчыны, але і не адмовіўся ад памкненняў аднавіць «імперыю Рурыкавічаў».

Вось у такі складаны і супярэчлівы час у Брачыслава Полацкага і нарадзіўся сын Усяслаў. Для Полацкай зямлі гэта быў перыяд адноснага спакою. Набыўшы статус незалежнасці, дзяржава толькі набіралася моцы, вызначаліся яе межы, да якіх з розных бакоў падбіраўся ўжо кіеўскі Яраслаў. Але адкрыта на абвастрэнне ён не ішоў, бо адчуваў, што Полацк здолее адстаяць свае інтарэсы. Таму пагражаў толькі полацкім суседзям. Хісткасць свайго становішча разумелі й палачане і на чужыя землі не квапіліся. Ды ў гэтым і не было патрэбы. Ім хапала і сваёй зямлі, багатай на дзікага звера і птушку, на рыбу ў блакітных азёрах, на адноена добрыя ўраджаі. Палачане маглі не толькі пракарміцца самі, але тое-сёе і прадаць у іншыя землі. У гарадах усё болей развіваліся рамёствы, за кошт гандлёвых і рамесных пасадаў раслі памеры і саміх гарадоў. Таму на працягу сарака чатырох гадоў летапісы не апавядаюць пра войны і

[1] Marx K., Engels F. Collected Works. M., 1986. Vol. 15. P. 77.
[2] Рыдзевская Е. А. Древняя Русь и Скандинавия в IX-XIV вв. М., 1978. С. 102-104.
[3] Лаврентьевская летопись // Полное собрание русских летописей. М., 1962. Т. 1. С. 299-301.

сваркі, у якіх удзельнічалі б полацкія князі. На Полаччыне быў спакой, поўны напружанай стваральнай працы на карысць роднай зямлі.

Год 1044. «У гэты час памёр Брачыслаў, князь полацкі, сын Ізяслава, унук Уладзіміра, бацька Усяслава, і Усяслаў, сын яго, сеў на стале».

Калі пачынаць апісваць жыццё Усяслава Чарадзея, то не раз давядзецца карыстацца словамі, накшталт: «Толькі аб ім напісаў летапіс, што...» І сапраўды, дзівосы ў летапісным апісанні жыцця Усяслава пачынаюцца адразу ад яго нараджэння. Большасць даследчыкаў слушна бачыць у гэтым выкарыстанне наўгародскімі, кіеўскімі і іншымі летапісцамі розных па велічыні фрагментаў з невядомых нам полацкіх летапісаў. Але хочацца спадзявацца, што, можа, калі-небудзь яны будуць знойдзены. Адзін з такіх летапісаў калісьці трымаў у руках В. Тацішчаў. Але і гэты летапіс знік. Тыя ж, якімі карыстаемся зараз мы, адчулі на сабе вялікі ўплыў наўгародскіх, кіеўскіх і іншых летапісцаў. І ўсё ж дзівосная вестка аб нараджэнні Усяслава дайшла да нас праз усе нягоды і дагэтуль чаруе сваёй загадкавасцю.

«Маці ж яго нарадзіла ад чарадзейства. Калі маці яго нарадзіла, на галаве яго была язьвена. І сказалі вешчуны[1] яго маці: «Гэтую сарочку навяжы на яго, няхай носіць яе да смерці». І носіць яе на сабе Усяслаў і сёння, таму і нялітасцівы ён на кровапраліцце».

Вось так некалькі летапісных радкоў паведамляюць аб нараджэнні чалавека. Ён яшчэ не мог сядзець, не тое што хадзіць, а ў гісторыі Полацкай зямлі і ў нашых усходнеславянскіх княствах быў зроблены першы загадкавы крок. Ужо з гэтага тэксту адно за адным узнікаюць пытанні: у выніку якога чарадзейства нарадзіўся Усяслаў? Чаму да яго калыскі, як на тысячу год раней да немаўляці Хрыста, прыйшлі вешчуны? Што за «язьвена» была ў яго на галаве? Якая сувязь паміж «язьвенай» і неміласэрнасцю князя? Неміласэрнасць да каго? І гэта далёка не ўсе пытанні, якія паўстаюць з тэксту.

Як ні дзіўна, але прасцей здагадацца, што за «язьвена» была на галаве князя ад нараджэння. Гэтаму ёсць тры тлумачэнні. Некаторыя гісторыкі (В. Я. Данілевіч, М. В. Каяловіч) лічылі, што гэта быў каўтун. Другія (Д. С. Ліхачоў, Б. А. Рыбакоў) — што рэшткі зародкавай абалонкі — амніёну[2], так званая сарочка, з якой калі-нікалі нараджаюцца дзеці. Трэція схільныя думаць, што гэта быў радзімы знак

---

[1] Вешчуны. — святары паганскай рэлігіі. Да прыняцця хрысціянства ў Полацкай зямлі існавалі язычніцкія капішчы — пантэоны багоў Мокашы, Перуна, Вялеса і інш., дзе вешчуны спраўлялі абрады. Сюды людзі прыносілі даніну, прасілі ў багоў удалага палявання і ўраджаю. Вешчуны як служкі тых паганскіх багоў былі самыя ўплывовыя людзі дахрысціянскага грамадства.

[2] Праўда, Д. С. Ліхачоў і Б. А. Рыбакоў не зусім дакладна называюць гэтае ўтварэнне «пасьледам». Паслед — тое, што выходзіць «пасля» — гэта не толькі зародкавая абалонка але і плацэнта з пупавінай.

на галаве, ці Божая знатамка. Мы схіляемся да другога тлумачэння, бо, адпаведна тэксту, толькі ў такім выпадку гэтую «язьвену» можна было навязаць ка галаву дзіцяці і насіць у якасці талісмана.

А вось чаму Усяслаў быў народжаны ад чарадзейства і якія вешчуны збіраліся каля яго калыскі — загадка больш складаная. Пачнем крыху здалёк...

Сярод мноства ўсходнеславянскіх гістарычных былін ёсць адна, якая, на думку большасці даследчыкаў, у тым ліку згаданых Д. С. Ліхачова і Б. А. Рыбакова, прысвечаная непасрэдна полацкаму Усяславу. Гэта — быліна «Волх Усяславіч»[1]. Вось як там апісваецца нараджэнне князя:

Па садзе, садзе зялёным
Хадзіла-гуляла маладая княгіня
Марфа Усяслаўна,
Яна з каменя скочыла на лютага змея —
Абвіўся той люты змей
Вакол чобата з зелен-саф'яну,
Вакол панчошкі шаўковай,
Хобатам б'е па белым клубе.
А ў тую пару княгіня понас панесла,
А понас панесла і дзіця нарадзіла.
А і на небе ўзышоў светлы месяц,
А ў Кіеве нарадзіўся волат магутны,
Як бы малады Волх Усяславіч:
Падрыжала сырая зямля,
Здрыганулася слаўнае царства Індзейскае,
Нават сіняе мора ўскалыхнулася
Дзеля нараджэння волата
Маладога Волха Усяславіча;
Рыбы пайшлі ў марскую глыбіню,
Птушкі паляцелі высока ў нябёсы,
Туры ды алені за горы падаліся,
Зайцы, лісіцы — у гушчары,
А ваўкі, мядзведзі — па ельніках,
Сабалі і куніцы — па астравах.

Хай нас не бянтэжыць, што месца нараджэння Усяслава прыпісваецца Кіеву. Гэта пазнейшая інтэрпрэтацыя. Мы ж зважым на тое, што бацькам Усяслава быліна называе Змея. Ці не тут загадка чарадзейнага нараджэння князя?

Змей — найстарадаўнейшы паганскі вобраз боства. Характэрным ён быў перш-наперш для балцкіх народаў і беларусаў. У паз-

[1] Былины // Библиотека народно-поэтического творчества / Под ред. С. Н. Азбелева. Л., 1984. С. 389—390

нейшай традыцыі Змей ператварыўся ў вужаку-вужыка, добрага абаронцу чалавека і яго сям'і. Відаць, нездарма ў беларускіх легендах і паданнях вобраз паўзуноў, у тым ліку і вужа, па частаце ўжывання супернічае толькі з ваўком. Вельмі папулярны вобраз змея і ў беларускіх казках. Акрамя таго, вобраз змея-дракона быў шырока распаўсюджаны ва ўсіх скандынаўскіх народаў. Ён дамінаваў ва ўжытковым выяўленчым мастацтве вугра-фінаў і, зразумела, балтаў. Пацвярджаюць гэта і шматлікія археалагічныя знаходкі бранзалетаў са змеепадобнымі канцамі, шырока распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі і Прыбалтыкі ў IX-XII стагоддзях. У навуцы яны, бясспрэчна, звязваюцца з уплывам балцкай матэрыяльнай і духоўнай культуры на славян. На самым пачатку мы пісалі пра асаблівасці славянскай каланізацыі тэрыторыі сучаснай Беларусі, якая дагэтуль была заселеная балтамі. Таму зразумела, што шмат якія спецыфічна балцкія элементы культуры сталі натуральнымі і роднымі для жыхароў Полацкай зямлі. Розніцы тут паміж простым людам і князямі не было. Трэба таксама адзначыць, што ў біблейным кантэксце словы «змей», «атрута змея» азначалі хітрасць, злосць, ідалапаклонства, бязбожнасць.

Па-другое, нягледзячы на тое што хрысціянства было прынята ў Кіеве ў якасці афіцыйнай рэлігіі, на Полаччыне яно ў такім выглядзе ўсталявалася на канцы XIII — пачатку XIV стагоддзя. Ніжэй да гэтага пытання мы яшчэ вернемся. А пакуль трэба зразумець, што паганства і яго светапогляды дамінавалі ў Полацкай зямлі на працягу XI стагоддзя.

Акрамя змея — сімвала паганства, нельга не зважаць на адну відавочную паралель у нараджэнні Усяслава Брачыславіча і... Хрыста. Як вядома, Хрыстос нарадзіўся ў Віфлееме, непадалёку ад Ерусаліма. Пад час гэтай падзеі Бог явіў над Віфлеемам вялікую зорку, каб паказаць мудрацам, іначай — валхвам, звярам, птушкам і раслінам шлях да Баганоснага немаўляці[1]. Доўгі час багасловы лічылі, што гэтая зорка была звышнатуральнай з'явай, што яна была бачная толькі вешчунам, а таму не магла быць прадметам навуковых астранамічных назіранняў. Але з часоў знакамітага вучонага астранома Кеплера (дарэчы, перакананага верніка) пачалі лічыць, што ўсё ж натрапілі на след гэтай дзівоснай зоркі. У 1603 годзе Кеплер назіраў супадзенне на зорным небе Юпітэра і Сатурна, якое вясной 1604 года стала яшчэ больш яўным у выніку далучэння да іх планеты Марс. 10 кастрычніка паблізу гэтых планетаў Кеплер заўважыў зорку, якая нейкі час зіхацела, «як асляпляльная яркая паходня, якая быццам

[1] Біблія. Матф. 2:1; 2: 2; 2: 10.

разгараецца моцным бляскам, іскрыцца і гарыць». Гэтаеназіранне, пацверджанае сучаснымі астраномамі, спрычынілася да падлікаў, адпаведна якім падобнае супадзенне планетаў і з'яўленне Зоркі сапраўды адбылося ў 747—748 гадах паводле рымскага летазлічэння. Прыблізна да гэтага часу і адносяць багасловы нараджэнне Хрыста[1].

Вернемся да Усяслава Полацкага. У той жа быліне «Волх Усяслававіч» ёсць наступныя радкі:

Стаў сабе Волх ён дружыну прыбіраць:
Дружыну прыбіраў у тры гады,
Ён набраў дружыну сабе сем тысяч,
Сам ён, Волх, у пятнаццаць гадоў,
І ўся дружына яго па пятнаццаць гадоў.

Калі князь пачынаў збіраць дружыну? Калі збіраўся ў паход або калі станавіўся паўнапраўным валадаром — стольным князем. У апошнім разе, адпаведна сярэднявечнаму рыцарскаму кодэксу, дружына прыносіла новаму князю клятву на вернасць. Менавіта пра гэта апавядае быліна. Малады ўзрост князя не павінны здзіўляць. Тады гэта было нармальнай з'явай. Варта прыгадаць, напрыклад, што Аляксандр Неўскі стаў наўгародскім князем ва ўзросце 16 гадоў. Зразумела, што былінны ўзрост пятнаццаць гадоў можа быць чыста ўмоўным. У якасці гістарычнага факта ім карыстацца нельга. І тым не менш...

Зробім просты матэматычны разлік. Мы ведаем дакладна з летапісаў, што Усяслаў стаў полацкім князем па смерці бацькі Брачыслава ў 1044 годзе. Калі ад 1044 адняць 15, то атрымаем 1029. А зараз давайце паглядзім, што ў гэтым часе адбывалася на Кіеўскай Русі.

У палітычным жыцці пасля міру, які ўсталяваўся пры дапамозе Яраслава і Мсціслава, было поўнае зацішша. 1029 год так і называецца: «мірнае лета». А вось у прыродзе адбываліся дзівосы. У 1028 годзе над Усходняй Еўропай з'явілася палярнае ззянне: «Адзнака змеепадобная з'явілася на небе так, што відаць была адусюль»[2]. Сучасная навука звязвае палярнае ззянне з павышэннем сонечнай актыўнасці. Значна павялічанай яна была ў перыядзе так званага малога кліматычнага оптымуму з 700 па 1450 год нашае эры. Але з гэтага вялікага храналагічнага перыяду амаль цалкам выпадае XI стагоддзе[3]. У гэтым стагоддзі былі толькі два палярныя ззянні — у

---

[1] Нюстрем Э. Библейский словарь. Торонто, 1982. С. 74—76, 522.
[2] Полное собрание русских летописей. М., 1962. Т. 30. С. 110.
[3] Борисенко Е. П., Пасецкий В. М. Экстремальные природные явления в русских летописях XI-XVII вв. Л., 1983. С. 44-45.

1016 і 1028 гадах. І толькі апошняе з іх мела выгляд змея. Не заўважыць яго было немагчыма.

А зараз давайце проста супаставім Біблію, летапіс і быліну.

| **Нараджэнне Ісуса Хрыста** | **Нараджэнне Усяслава Чарадзея** | |
|---|---|---|
| *Біблія* | *Летапіс* | *Быліна* |
| 1. Нараджэнне ад Святога Духа. | 1. Нараджэнне ад чарадзейства. | 1. Казачнае нараджэнне (ад Змея). |
| 2. Вешчуны прыходзяць на пакланенне. | 2. Каля калыскі вешчуны. | 2. Усяслаў названы Волхам Усяславічам. |
| 3. На небе Віфлеемская зорка. | 3. На небе ззянне ў выглядзе змея. | 3. Ягоны бацька — Змей. |
| 4. Звяры, птушкі, расліны прыходзяць пакланіцца. | | 4. Звяры, птушкі, рыбы хаваюцца. |

Падабенства летапіснага і быліннага сюжэтаў да Бібліі відавочнае. На наш погляд, няма ніякіх падстаў сумнявацца, што Усяслаў Чарадзей нарадзіўся зімою 1028-1029 года. Гэтая дата будзе ўспрымацца з большым даверам і разуменнем, калі ўлічыць, што летапісы складаліся манахамі. Для іх жа, людзей дасведчаных у Святым Пісанні, было цалкам натуральна занатоўваць падзеі навакольнага свету ў стылі Бібліі, адпаведна яе сюжэтаў.

З гэтай даволі верагоднае гіпотэзы паўстае яшчэ адно цікавае назіранне, якое яе падмацоўвае. Нараджэнне Хрыста — з'ява станоўчая і доўгачаканая. Увесь свет узрадаваўся ёй. Чаго нельга сказаць пра нараджэнне Усяслава, а тым больш у трактоўцы летапісцаў, погляды якіх прасякнуты антыполацкімі настроямі. На іх думку, полацкі князь быў пастаянным парушальнікам спакою, варожа настроеным да Кіева, Ноўгарада і Чарнігава. Ён не ішоў на пагадненні, якія пагражалі самастойнасці і незалежнасці Полацкай зямлі. На той час, калі летапісцы пісалі аб нараджэнні Чарадзея, ўсё гэта яны ведалі. Нават аўтар «Слова пра паход Ігараў» у канцы XII стагоддзя не абмінуў гэта прыгадаць. Вось таму ў адрозненне ад Хрыста для Чарадзея стварылі ў нейкім сэнсе вобраз-антыпод. Нараджаецца ён хоць і чарадзейна, але не ад Бога – ад паганага Змея. Да Хрыста сыходзяцца вешчуны-каралі, якія трактуюцца Бібліяй як мудрацы, а да Усяслава — вешчуны-паганцы. Менавіта ў такім сэнсе яны яшчэ не раз будуць прыгадвацца летапісцамі. Да Хрыста на пакланенне сыходзяцца звяры, птушкі, расліны, ад Усяслава ж,

наадварот, пры яго нараджэнні ўсе ўцякаюць, хаваюцца. Нават сама Матухна-зямля дрыжыць у прадчуванні нялёгкай ношы.

Такім чынам, адметным было ўжо самое з'яўленне на свет Усяслава, нездарма названага пазней Чарадзеем. Для ягоных сучаснікаў яно, мабыць, было знакам надыходу незвычайных падзей. А наперадзе былі яшчэ 73 гады перамог і паражэнняў, узлётаў і падзенняў.

## МАЦУЮЧЫ СПАДЧЫНУ СВАЮ

*На полацкім пасадзе * Першыя дзесяцігоддзі * Чацвёртая ў свеце * Магутны горад на Дзвіне * На мяжы чужынскіх земляў * Валадарская навука*

Калі ісці гістарычным шляхам услед за летапісамі, то 16 гадоў, якія мінулі пасля ўзыходжання Усяслава на полацкі пасад, нічым для гэтай зямлі не вызначаліся. За гэты час у Кіеве памірае жонка Яраслава Мудрага грачанка Ірына, пасля — сын Уладзімір, а ў 1054 годзе і сам Яраслаў. Перад смерцю князь паспеў падзяліць усе землі паміж сваімі сынамі. Старэйшаму, Ізяславу, дастаўся Кіеў, Святаславу — Чарнігаў, Усеваладу — Пераяслаўль, Ігару — Уладзімір, Вячаславу — Смаленск. Праз тры гады памёр Вячаслаў. У Смаленску браты пасадзілі Ігара, які памёр у 1060 годзе.

За гэты час адбываюцца значныя падзеі ў духоўным жыцці Усходняй Еўропы. Чалавек па імю Анціп з Любеча прыйшоў да Афона, дзе быў пастрыжаны ў манахі пад імем Антоній. Ігумен афонскі сказаў яму: «Ідзі назад на Русь, і хай будзе на цябе багаслаўленне ад Святой Гары, бо многія ад цябе чарняцамі стануць».

Прыйшоў Антоній у Кіеў. Не знайшоўшы жытла, пасяліўся ў пячоры на ўзбярэжжы Дняпра. Так быў пакладзены пачатак славутаму Пячорскаму манастыру. Вось амаль і ўсё, калі не лічыць значнай падзеяй невялікі і ўдалы набег Усевалада на качэўнікаў-торкаў і дамову аб замірэнні з полаўцамі.

Сапраўды, калі паглядзець на падзеі гэтых 16 гадоў, то, здаецца, мір і згода ўсталяваліся паміж князямі і землямі — проста ідылія! Тры браты, тры сыны Яраслава ўсталявалі сваю ўладу над Кіеўскай Руссю. Пасля Яраслава і Брачыслава гэты трыумвірат быў другім у гісторыі пагадненнем князёў. Толькі на гэты раз Полацк не браў у ім удзелу. Усяславу Чарадзею было не да Кіева, Пячорскага манастыра і далёкіх торкаў з полаўцамі. Ён быў цалкам заняты справамі сваёй дзяржавы.

Калі вядомыя сёння летапісы нічога не гавораць пра дзейнасць Усяслава тых гадоў, то пра некаторыя звесткі можна даведацца з іншых крыніц, напрыклад археалагічных.

Якім быў Полацк у IX-X стагоддзях, мы ведаем. Гэта — невялікае гарадзішча плошчаю каля 0,1 гектара і паселішча вакол яго, не большае за 6,5 гектара. Да сярэдзіны XI стагоддзя істотных зменаў у тапаграфіі горада не адбывалася. Хіба што павялічыўся вакольны горад — да 20 гектараў. А вось у сярэдзіне — другой палове XI

стагоддзя выгляд "Полацка рэзка мяняецца. Па загаду Усяслава Чарадзея палачане і жыхары воласці будуюць новы замак — дзядзінец. Назву яму даюць Вышні замак. На прыгожым узвышшы, у самай сутоцы Палаты і Дзвіны, раўняюць пляцоўку, падвозяць бярвенне, гліну, вапну. Хто ведае, колькі людзей сышлося на тую старадаўнюю талаку! Ды толькі работа віравала такімі тэмпамі, што нам, сённяшнім, не грэх бы і павучыцца.

Задума князя прадбачлівая. Досыць гораду хавацца ў выгінах Палаты, досыць князю і дружыне туліцца на невялікім падвор'і, а іншаземным гандлярам шукаць сабе месца для торгу на вузкіх, заціснутых дварамі вулачках. Час наспеў паказацца гораду ва ўсёй сваёй велічы і прыгажосці, а князю і мужам-палачанам — у славе і багацці. Зрабіць жа гэта можна было толькі тады, калі князевы палаты, а разам з імі і сам горад будуць перанесеныя на новае месца. Хоць князь малады, затое дарадцы сталыя. Відаць, яны і падказалі князю, што рабіць. А як — ён і сам ведаў.

Вянок за вянком узнімаліся новыя гарадскія сцены і вежы. Ды не абы-якія, а ў некалькі бярвёнаў таўшчынёю. Каля іх ставілі клеці для жылля, запасаў зброі і правіянту. Непадалёку ад паўночнага прасла сцяны градасекі размячалі контуры будучага князеўскага палаца. Але галоўная работа ішла ў самым цэнтры будучага замка: тут будавалі храм.

На той час ва Усходняй Еўропе ўжо было некалькі цэркваў у буйных гарадах: Дзесяцінная і Сафійскі[1] сабор у Кіеве, Сафійскі сабор у Ноўгарадзе. Першыя храмы былі не столькі сімваламі хрысціянскага веравызнання, колькі неадлучнай часткай велікакнязеўскай улады. Глыбокі сэнс самой хрысціянскай бажніцы ў яе саборнасці — усё збіраецца разам пад яе сутарэннем, як ва ўлонні царквы, дзеля спасціжэння Бога, выратавання сваёй душы і душы бліжняга. Саборнасць — ідэя аб'яднання людзей, іх фізічных і духоўных сіл. Вось чаму хрысціянства прыйшлося так натуральна да часу, калі складаліся розныя дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе. Царква дапамагала людзям у яднанні, заклікала іх да мірнага суіснавання. Гэтыя памкненні імпанавалі розным князям, валадарам розных земляў. Не быў выключэннем і Усяслаў.

Не дзіўна, што ў якасці ўзору для галоўнага храма Полацка быў абраны Сафійскі сабор. Такія саборы былі ўжо ў Канстанцінопалі — Царградзе, у Кіеве і Ноўгарадзе. Канстанцінопальская Сафія была збудаваная пры імператары Юстыніяне ў 532-537 гадах. Гэтакі тып і

---

[1] Сафія, грэцкае — σοφία, перакладаецца як мудрасць, веды, майстэрства.

назоў храма былі характэрныя для таго часу. Варта прыгадаць, што нават знакаміты афінскі Парфенон, ператвораны ў хрысціянскую бажніцу, гэтак сама быў прысвечаны Сафіі[1]. Сафійскі храм у Кіеве быў пабудаваны візантыйскімі майстрамі не пазней як у 30-х гадах XI стагоддзя, наўгародская Сафія пабудаваная ў 1045-1050 гадах[2].

Полацк, які быў роўны з Кіевам і Ноўгарадам, іншага сабора будаваць і не мог. Усе гэтыя саборы на ўсходнеславянскіх землях узводзіліся фактычна адной арцеллю. Таму пасля таго як візантыйскія дойліды скончылі сваю работу ў Ноўгарадзе, яны неўзабаве былі запрошаныя ў Полацк. Даследчыкі старадаўняй архітэктуры мяркуюць, што адбылося гэта каля 1050 года. А скончана праца ў 1055 годзе, калі лічыць, што ў Полацку, як і ў Ноўгарадзе, на гэта спатрэбілася пяць гадоў.

Такім чынам, у сярэдзіне XI стагоддзя ў Полацку быў узведзены трэці ва Усходняй Еўропе Сафійскі сабор. Ён значна адрозніваўся ад сваіх папярэднікаў. Перш за ўсё памерамі, але сутнасць яго была нязменная. Цікавы і другі факт. Гісторыя данесла да нас імёны дойлідаў, якія будавалі полацкую Сафію. Пад час археалагічных раскопак у самім саборы археолагі знайшлі вялікі камень-валун, пакладзены ў падмурак храма каля даўняга ўваходу. На гэтым камені былі надрапаныя імёны: Давыд, Таўма, Мікула, Капес. Хутчэй за ўсё яны былі з той самай арцелі, якую запрасілі ў Полацк з Ноўгарада[3].

Будаваўся горад, будаваўся сабор. Полацкая зямля набіралася сілы, а князь Усяслаў — мудрасці.

Аддавала яго маці грамаце вучыцца,
А грамата Волху ў навуку пайшла;
Пасадзіла яго ды пяром пісаць,
Пісьмо яму ў навуку пайшло.
А і будзе Волх дзесяці гадоў,
Прывучаўся Волх ды прамудрасцям:
А і першай прамудрасці вучыўся
Абярнуцца ясным сокалам;
Ды другой жа мудрасці вучыўся ён, Волх,
Абярнуцца шэрым воўкам;
Ды трэцяй жа мудрасці вучыўся Волх
Абарочвацца гнядым турам — залатыя рогі,
А і будзе Волх у дванаццаць гадоў.

---

[1] Лихачев В. Искусство Византии IV-XV веков. Л., 1986. С. 45-49.
[2] Древняя Русь: Город, замок, село. М., 1985. С. 156.
[3] Булкин В. А., Рождественская Т. В. Надпись на камне из храма Софии в Полоцке // Памятники культуры: Новые открытия 1982 г. Л., 1984. С. 12-17.

Грамату і навуку князь спасцігаў з маленства, яшчэ пры жыцці бацькі Брачыслава. Адукацыя ў князеўскіх сем'ях па тым часе была самай дасканалай. Параўнаць яе можна было толькі з выхаваннем у манастырах. Але калі ў манастырах перавага аддавалася чытанню і пісанню адпаведна Бібліі і апакрыфічных твораў айцоў царквы, то для князя гэта была яшчэ і валадарская, дружынная навука. Паводле кодэксу рыцарскага гонару, які быў шырока распаўсюджаны ва ўсёй Еўропе, князь мусіў дасканала валодаць усімі відамі тагачаснай зброі. Сапраўдным ваяром лічыўся той, хто сядзеў на кані лепш, чым хадзіў па зямлі[1]. Як даваліся князям гэтыя навукі? Кожнаму па-рознаму. Ведаючы жыццёвы лёс Усяслава, можна пэўна сказаць, што для яго з маленства абедзве навукі былі натуральныя. Калі яшчэ не хадзіў разам з бацькам у паходы, то, безумоўна, браў удзел у паляваннях. У тагачасных полацкіх лясах было дзе выявіць свой спрыт і розум, Хапала і зуброў, і мядзведзяў, і тураў. У вялікай пашане было сакалінае паляванне на дробнага звера: ліса, зайцоў і птушак. Нездарма ў рыцарскай песні, як часам называюць «Слова пра паход Ігараў», вялікае месца і ўвага надаецца вобразу сокала і лебедзі: «О, далёка сокал дапаў, птушку б'ючы,— да мора!» «...Паляцеў сокалам пад аблокамі, б'ючы гусей і лебедзяў на снеданне».

Характар князеўскай улады ў гарадах і землях вынікаў з неабходнасці весці войны, бараніць ад ворагаў рамеснікаў, вяскоўцаў, гандляроў. У нарманскіх землях для вікінгаў гэта быў асноўны занятак і сродак існавання. Вольныя варажскія дружыны вандравалі на працягу амаль усёй сваёй гісторыі. Яны то рабавалі сваіх суседзяў, то наймаліся за грошы да іх на службу[2]. А такія, як Рурык, Рагвалод, вялі аседлы спосаб жыцця. І землі, на якіх яны жылі, для іх нашчадкаў сталі ўжо роднымі. Яны тут нараджаліся, жылі і паміралі. Толькі асноўная функцыя князя і яго дружыны заставалася нязменная. На першым этапе свайго існавання яны не мелі права ўмешвацца ў палітычнае і эканамічнае жыццё, бо тая ці іншая воласць належала мясцовым «мужам» — старэйшынам. Гэтым, дарэчы, тлумачыцца і сам факт прызвання варагаў. Але з часам князеўскі род усё больш і больш асіміляваўся, набываў рысы мясцовай дынастыі, прымаў мову і традыцыі тутэйшага насельніцтва і, натуральна, сам станавіўся мясцовым. І толькі тады, калі нашчадкі прышлых князёў па-сапраўднаму станавіліся арганічнай часткай таго народа, сярод якога жылі, яны

[1] Кардани Ф. Истоки средневекового рыцарства М 1987 С. 350—351.
[2] Ловмяньский Г. Русь и норманы. М., 1985. С. 89-91; Славяне и скандинавы / Под ред. Е. А. Мельниковой. М., 1986.

пачалі ўсталёўваць сваё верхавенства ў дзяржаўных справах. Але ваенныя функцыі па-ранейшаму заставаліся за мясцовымі князямі.

Варта зазначыць, што першапачаткова князь вылучаўся сярод іншых дружыннікаў толькі асабістымі якасцямі: сілаю, спрытам, уменнем валодаць зброяй. У бітвах ён заўсёды мусіў быць наперадзе. Традыцыя правядзення ў Заходняй Еўропе рыцарскіх турніраў узнікла ад старадаўняга звычаю, калі спрэчкі і ўзброеныя канфлікты паміж нейкімі групамі людзей вырашаліся праз двубой валадароў — кануңгаў і князёў. Рыцарскія турніры на нашых землях не праводзіліся або мы проста не ведаем пра іх. Але князь, які ўзначальваў дружыну, павінны быў першы ўступіць у бой. Зразумела, што першаму і мацнейшаму належала і большая здабыча. Ён і багацейшы быў. Так вылучалася князеўская знаць. З часам для яе адпала неабходнасць першымі пачынаць бой. Замест князёў у адзінаборства ўступалі воіны. Так адбылося, напрыклад, на Куліковым полі ў 1380 годзе, калі супроць татарына Чалубея выйшаў манах Перасвет. У XI стагоддзі гэтага яшчэ не было. Таму для Усяслава Полацкага вайсковая навука была ці не самай галоўнай.

Не менш істотная была для князя адукацыя — уменне чытаць і пісаць. Нагадаем, што да 1044 года, калі Чарадзей стаў полацкім князем, хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі ўжо існавала і пашыралася болей за паўстагоддзе. Яго дзед — Ізяслаў — быў не толькі даволі адукаваным для таго часу чалавекам, але і шчырым вернікам. Магчыма, ён разам са сваёй маці Рагнедай-Анастасіяй, манахамі-місіянерамі і прывёз на Полаччыну першыя кнігі. Гэта было «Святое Пісанне», перакладзенае на славянскую мову першаасветнікамі братамі Кірылам і Мяфодзіем, і так званая апакрыфічная літаратура. Да апошняй адносіліся тэксты, якія не ўвайшлі ў кананічны склад Старога і Новага запаветаў. Напрыклад, «Гісторыя Якава аб нараджэнні Марыі», «Евангелле ад Мікадзіма», «Чыннасць Паўла і Фёклы», «Евангелле ад Фамы» і, магчыма, некаторыя іншыя[1]. Незвычайныя па тым часе каштоўнасці захоўваліся ў бібліятэцы полацкага Сафійскага сабора[2].

Адукацыю князёў, у тым ліку і Усяслава, слушна будзе звязаць з пашырэннем і развіццём хрысціянства на Полаччыне. Да таго часу,

---

[1] Апокрифы древних христиан. М., 1989.

[2] Апошнія звесткі пра існаванне гэтай бібліятэкі датуюцца 1579 годам. Пасля аблогі і адваёвы горада войскамі на чале са Сцяпанам Батурам яе бачыў сакратар караля Рэйнгальд Гейдэнштэйн. Сярод іншых звестак таго часу ён пакінуў і такі запіс: «У вачах адукаваных людзей не меншую каштоўнасць, чым уся іншая здабыча, мела знойдзеная там бібліятэка. Акрамя летапісаў, у ёй было шмат твораў грэцкіх айцоў царквы і паміж імі — творы Дыянісія Арэапагіта аб нябеснай і царкоўнай іерархіі, усе — на славянскай мове. Большая частка іх, па сведчанні летапісцаў, была перакладзеная на гэтую мову з грэцкай Мяфодзіем і Канстанцінам. (Гейденштейн Р. Записки о Московской войне (1578—1582 гг.). СПб., 1889. С. 71.)

як Чарадзей стаў вялікім князем полацкім, у горадзе ўжо існавала епіскапія і, зразумела, хрысціянскія храмы[1]. Пад 1092 годам летапіс прыгадвае полацкага епіскапа Нічыпара, які стаў кіеўскім мітрапалітам[2].

Праз царкву пашыралася адукацыя, хрысціянская культура, якая тады ўжо мела тысячагадовую гісторыю. Пісьменства, рэлігійныя кнігі не толькі спрыялі адукацыі людзей, але і давалі магчымасць заносіць у аналы гісторыі значныя падзеі. Так з'явіліся летапісы. Яны былі прыдуманыя не нашымі продкамі. Традыцыя весці падобныя хронікі і «гісторыі» ўжо даўно існавала ў Заходняй Еўропе і на Усходзе. Прыгадаем хоць бы «Гісторыю франкаў», «Гісторыю» Карнелія Тацыта, Герадота, Фукідзіда або «Жыццё дванаццаці Цэзараў» Гая Святонія Транквіла. Святары і манахі ўзялі на сябе вялікую місію: вучыць людзей грамаце, пісаць летапісы. І ў гэтым вялікая іх заслуга.

Такім чынам, Усяслаў Чарадзей як прадстаўнік вядомай князеўскай дынастыі, можна меркаваць, атрымаў па тых часах бліскучую адукацыю. Ускоснае сведчанне гэтага і будаўніцтва Сафійскага сабора, і падтрымка яго кіеўскімі святарамі ў падзеях 1067-1068 гадоў. Ёсць нават падставы меркаваць, што ён валодаў не толькі роднай моваю. Яшчэ дзед Усяслава — Ізяслаў Уладзіміравіч — на асабістай пячатцы перадаў сваё імя славянскімі літарамі, але ў грэцкім гучанні. Гэтая пячатка знойдзена ў Ноўгарадзе і лічыцца самым старажытным на тэрыторыі Усходняй Еўропы помнікам пісьменства пасля надпісу «Гороушна» на слоі, знойдзеным пад Смаленскам[3].

Калі лаціну ўважаць за адну з афіцыйных моў таго часу (а большасць літаратурных твораў пісалася на ёй або на грэцкай), то, відаць, на гэтых жа мовах вялі набажэнства і першыя святары, якіх патрыярхі прысылалі з Канстанцінопаля. У штодзённым жыцці полацкаму князю неабходна было ведаць і мовы іншых людзей, якія насялялі Полацкую зямлю. Дарэчы, на думку гісторыка М. Ермаловіча, маці Усяслава паходзіла з фінскага племя водзь[4]. Князю часта даводзілася карыстацца дапамогаю эстаў, ліваў, семігалаў і інш. Гэтыя народы былі хоць і падобныя, але разнамоўныя. Мы, вядома, не збіраемся сцвярджаць, што Усяслаў Чарадзей быў паліглотам у

---

[1] Найстаражытнейшымі праваслаўнымі цэрквамі ў Полацку, відаць, былі царква Багародзіцы, якая пад 1158 годам згадваецца як «Старая», а таксама царква манастыра Іаана Прадцечы, заснаваная ісландскім місіянерам Св. Торвальдам. Ёсць падставы меркаваць, што менавіта гэтая царква папярэднічала будаўніцтву ў Полацку Сафійскага сабора.

[2] Найстаражытнейшая епіскапская катэдра на Беларусі была ў Тураве (1005 год). (Рапов О. М. Русская церковь в IX — первой половине XII в.: Принятие христианства. М., 1988. С. 366—369.)

[3] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX—XII вв. М., 1980 С. 250—251.

[4] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 113.

сучасным разуменні слова, хоць чалавек ён быў надзвычай здольны і таленавіты. Але нават у межах Полацкай зямлі цяжка ўявіць яго палітычную дзейнасць без ведання розных моў і дыялектаў.

Імкненне ўмацаваць свае княства, зрабіць яго больш трывалым не абмяжоўвалася ў дзейнасці Усяслава толькі полацкім наваколлем. У гэтыя ж гады XI стагоддзя набываюць вядомасць і іншыя гарады Полацкай зямлі: Лукам'е, Усвяты, Браслаў, Друцак, Заслаўе, Лагошаск, Копысь, Орша. Менавіта ў XI стагоддзі гарадамі становяцца Кукейнос і Герсіка[1], дзе было мяшанае крывіцка-балцкае насельніцтва. Гэтыя гарады таксама належалі Полацкай зямлі. І, вядома, Менск.

Перад Усяславам паўставала надзвычай складаная задача: трэба было не проста аб'яднаць прымусам навакольныя землі (што, дарэчы, на той час было неперспектыўна), а стварыць такія ўмовы, каб гэтыя землі і народы жылі ў адзінай непарыўнай братняй супольнасці. Чым мацнейшымі былі б паміж імі добраахвотныя сувязі, тым мацнейшай была б і ўся дзяржава. Усяслаў не імкнуўся аб'ядноўваць Полацкую зямлю агнём і мячом, як гэта рабіў яго прашчур Уладзімір, бо, мабыць, разумеў, што імперыі, заснаваныя на сіле, доўга не жывуць. Ён праводзіў іншую, мірную палітыку, будаваў і ўмацоўваў новыя гарады.

Нягледзячы на тое што землі Усходняй Еўропы скандынавы называлі «краінай гарадоў» — Гардарыкай, сапраўдных гарадоў было не так і многа. Большасць з іх толькі таму лічыліся гарадамі, што былі агароджаныя сценамі або тынам. За гэтымі сценамі не абавязкова жылі гараджане-рамеснікі. Многія з так званых гарадоў выконвалі эпізадычную ролю аховы навакольнага насельніцтва пад час той ці іншай ваеннай навалы. У некаторых жылі старэйшыны і мясцовыя дробныя князькі, некаторыя выконвалі ролю паганскіх капішчаў. Большая ж частка людзей жыла ў наваколлі гэтых «градаў», у вёсках. Так ці інакш, але нават такія гарады выконвалі ролю цэнтра прыцягнення акругі. Тут збіраліся на раду, прыносілі ахвяры багам, даніну, гандлявалі. Менавіта апошняе і было скарыстана Усяславам для аб'яднання Полацкай зямлі.

Роля Полацка ў дачыненні да іншых навакольных земляў была падобная да ролі князя і яго дружыны ў дачыненні да горада. Полацк браў пад сваю ахову тых, хто згаджаўся з ім «быць за адзін». Патранат з боку магутнага Полацка быў надзвычай выгадны для мясцовых плямёнаў і знаці. Бо, па-першае, у любым выпадку яны мусілі падпа-

[1] Тэрыторыя сучаснай Латвіі. Зараз гэта гарадскія паселішчы. Кокнесэ Стучкінскага раёна і Ерсіка Прэйльскага раёна Латвіі. На месцы старадаўніх замкаў засталіся гарадзішчы-пагоркі, якія неаднойчы даследаваліся археолагамі.

радкавацца камусьці з больш магутных княстваў, якія пачалі набіраць сілу пасля распаду «імперыі Рурыкавічаў». Па-другое, паміж навакольнымі землямі і Полацкам ужо існавалі даволі трывалыя эканамічныя і гандлёвыя сувязі. Па-трэцяе, крывічы-палачане, як ніхто іншы, былі блізкія па этнічным паходжанні, па балта-славянскай крыві да сваіх суседзяў. Таму зразумела, што дрыгавіцкія і часткова балцкія землі выбралі ў якасці свайго апекуна Полацк, горад, які можна было параўнаць хіба толькі з Кіевам, Ноўгарадам ці Смаленскам.

Усе пералічаныя раней полацкія гарады былі розныя паводле сваіх памераў і значнасці. Але першым пасля Полацка лічыўся старажытны Менск. Гэта тлумачыцца тым, што вялікая роля ў поліэтнічным полацкім саюзе належала дрыгавічам. Па ўзроўні свайго эканамічнага, культурнага і, відаць, палітычнага развіцця яны стаялі не ніжэй за крывічоў-палачанаў. Таму значную ролю надаваў Менску і Усяслаў Чарадзей. Гэта паказалі падзеі 1067 і 1085 гадоў. Старажытны Менск, які ўзнік пачаткова за 16 кіламетраў на захад ад сучаснага, вядзе сваю гісторыю з IX стагоддзя. У X-XI стагоддзях яго памеры былі блізкія да памераў тагачаснага Полацка і складалі каля 31 гектара[1]. На пачатку XI стагоддзя горад бурна развіваўся дзякуючы актыўнаму гандлю, які праходзіў цераз сэрца дрыгавічах земляў у басейне Бярэзіны, Нёмана і Пцічы. Хаўрус двух магутных гарадоў у межах Полацкага княства быў гарантыяй узаемабяспекі і росквіту Полацкай дзяржавы.

Хто ведаў тады, у сярэдзіне XI стагоддзя, што нават магутнае войска Усяслава не паспее абараніць Менск ад спусташальнага набегу Яраслававічаў і што адрадзіцца гораду будзе ўжо наканавана ў сутоцы Свіслачы і Нямігі... Але ўсё гэта наперадзе.

Калі была спасцігнута «тэарэтычная» навука, вызначаны межы княства, умацаваны гарады, надышоў час Усяслава паспрабаваць сябе ў справе. Хутка здарылася і нагода. Да паўднёвых кіеўскіх земляў наблізіліся стэпавікі — торкі. Раней Кіеву пагражалі з поўдня печанегі, але зараз паўсталі ворагі не менш небяспечныя. Кіеўскія князі браты Яраславічы — Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад запрасілі Усяслава Чарадзея ўзяць удзел у паходзе на торкаў. Каб перамагчы качэўнікаў, патрэбныя былі вялікія сілы, і войска Усяслава было дарэчы. Полацкі князь не мог адмовіць Яраславічам, тым больш што падстаў для гэтага не было, а дамова паміж іх бацькамі — князямі Яраславам і Брачыславам — толькі спрыяла міру, усталяванаму апошнімі гадамі на ўсіх усходнеславянскіх землях.

---

[1] Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. С. 63—72.

М. Ермаловіч мяркуе, што адной з умоў, на якіх Усяслаў удзельнічаў у паходзе, была дамоўленасць, што пасля смерці смаленскага князя Ігара да Полаччыны адыдуць гарады Копысь і Орша. Але, як піша сам даследчык, крыніцамі гэта не пацвярджаецца. Тым не менш такая дамоўленасць магла існаваць. Гарады Орша і Копысь стаялі на самай мяжы Полаччыны і Смаленшчыны. На працягу гісторыі феадальных часоў яны неаднойчы мянялі сваю прыналежнасць да той ці іншай зямлі. Але акрамя сур'ёзных палітычных мэтаў паходу варта ўлічыць і чыста суб'ектыўныя, чалавечыя. Чарадзею гэтым часам было блізка 31 года. Малады, разумны, дужы, ён меў добрую дружыну, моцнае княства. Ці мог ён доўга сядзець дома без сур'ёзнай справы? Трэба было выпрабаваць сваю сілу, сваё войска, разведаць, на што знатныя ягоныя дзядзькі — Яраславічы. Апрача таго, аб'яднаўшыся, князі выставілі такую вялікую сілу, што нават летапісец напісаў: «незлічонае войска». Яны маглі спадзявацца на хуткую і лёгкую перамогу. Так яно і адбылося: торкі фактычна разбегліся, убачыўшы аб'яднаныя князеўскія дружыны. Князям — гонар, дружыне — слава.

# МЕЧ РАГВАЛОДА

*Збіранне войска * Хольмградскія званы Нямігі крывавыя берагі * Праклён парушальнікам клятвы * З кіеўскіх вязняў — у кіеўскія князі * Загадка Тмутараканя * Куды паклікалі званы?*

Спакой на Полацкай зямлі доўжыўся яшчэ пяць гадоў. Пасля паходу на торкаў Усяслаў Чарадзей бавіў час у стольным Полацку. Можна меркаваць, што пры апошняй сустрэчы з дзядзькамі паміж Полацкам і Кіевам была дасягнута нейкая дамоўленасць аб падзеле сфераў уплыву ва Усходняй Еўропе. Магчыма, ужо тады Чарадзей адстойваў прынцып, які толькі праз 37 гадоў на Любецкім з'ездзе князёў прагучыць як закон: «Кожны хай трымае вотчыну сваю». Але ў 60-х гадах Яраславічы былі далёкія ад разумення такіх прынцыпаў. Ім не давала спакою дзедава і бацькава слава Яны выношвалі ідэю стварэння адзінай дзяржавы, якая падпарадкавала б Кіеву ўсе землі ад Чорнага мора да Балтыкі.

Разглядаючы падзеі наступных гадоў, гісторыкі звычайна рухаюцца па наезджанай каляіне. Новы кругабег міжусобіц пачынаюць адлічваць ад летапіснага паведамлення, што ў 1065 годзе Усяслаў Полацкі пачаў збіраць войска. Маўляў, ён і паклаў пачатак князеўскім звадкам. Але, калі быць аб ектыўным, трэба бачыць усю сітуацыю, якая склалася ў гэтым часе.

Пасля смерці смаленскага князя Вячаслава Яраславіча і ўладзімірскага Ігара Яраславіча ў 1060 годзе Яраславічы падзялілі іх удзелы паміж сабою. У тым ліку і Смаленск. Горад стаў цалкам залежаць ад Кіева. У Кіеве тады сядзеў Ізяслаў. Але згодна з перадсмяротным запаветам Яраслава Мудрага рабіць гэта яны не мелі права.

Пасля смерці Вячаслава смаленскага застаўся яго сын Барыс. Але ён не атрымаў законнай бацькавай вотчыны, бо яе заняў адзін з сыноў Яраслава Мудрага — Ігар. Пасля смерці Ігара абодва яго сыны — Давыд і Усевалад — таксама засталіся без надзелаў.

Тым часам у братоў-трыумвіраў выраслі дзеці, якім трэба было даваць надзелы. Зрабіць гэта яны вырашылі за кошт пляменнікаў-сіротаў. Гэтым тлумачыцца падзел Смаленска і тое, што ў 1064 годзе мусіў бегчы з Ноўгарада князь Расціслаў. Разам з ім пайшла дружына, ваявода Парэй і Вышата — сын ваяводы Астраміра. Усе яны падаліся ў Тмутаракань[1].

---

[1] Тмутаракань — горад на Таманскім паўвостраве (цяпер станіца Таманская Краснадарскага краю) У VI стагоддзі тут існаваў антычны горад Германаса, у VIII—IX стагоддзях — паселішча Таматарха, якое ўваходзіла ў склад Хазарскага

На «вызваленых» такім чынам землях спрабуе ўладкавацца сын Усевалада кіеўскага — Уладзімір (Манамах), а трохі пазней — сын Святаслава — Глеб.

Паўстае пытанне: якое дачыненне да ўсіх гэтых падзей за межамі Полаччыны меў Усяслаў Чарадзей? На першы погляд, ніякага, але на самой справе — непасрэднае. Усяслаў быў блізкі сваяк памянёных князёў-сіротаў. Па мерках таго часу ён стаяў у адным шэрагу з усімі сынамі Яраслава, адпаведна меў роўнае з імі права на валадарства і развязанне пытанняў у межах былой дзяржавы Уладзіміра Яснае Сонейка. І калі Яраславічы пакрыўдзілі сваіх пляменнікаў, то, акрамя Усяслава Полацкага, ім не было да каго звярнуцца. Тым болей што Усяслаў Чарадзей трывала стаяў на пазіцыях свайго бацькі Брачыслава ў пытанні незалежнасці і самастойнасці розных княстваў.

У такой сітуацыі Усяслаў Полацкі быў не проста трацейскім суддзёю, але непасрэдна зацікаўленай асобаю. Сапраўды, дзе была гарантыя, што, падзяліўшы землі братоў, Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад не возьмуцца дзяліць і Полаччыну? Беспакаранасць і бязмежнасць улады разбэшчвае гэтак жа, як спадзяванне на вялікую вайсковую моц. Таму мы мяркуем, што так ці іначай, але выгнаныя са сваіх вотчын малодшыя князі звярталіся па дапамогу ў Полацк. Адстойваючы прынцыпы князеўскага гонару, Усяслаў не мог не падтрымаць сваіх збратдзетных і трохчленных братоў. Вось чаму, калі ў 1064 годзе Яраславічы прымусілі бегчы з Ноўгарада Расціслава, на наступны год Усяслаў Чарадзей «поча рать держати». Настаў час дастаць з похвы меч справядлівасці — МЕЧ РАГВАЛОДА.

Першы паход Усяслававых дружын быў скіраваны на Пскоў. І не дзіўна, бо гэты горад у непасрэднай блізкасці і залежнасці ад Ноўгарада мог стаць, па слушнай заўвазе М. Ермаловіча, плацдармам для нападу на Полацк і яго навакольныя землі. Да горада былі падцягнуты вялікія сілы, муры мязджэрылі сценабітнымі парокамі. Нягледзячы на магутны наступ, пскоўскі замак застаўся непрыступны. Але, думаецца, што ў Чарадзея не было мэты абавязкова захапіць горад. Паход на Пскоў стаўся адно папярэджаннем для Яраславічаў аб магчымых выніках іх бяздумнай палітыкі. Пскоўскі эпізод з'явіўся нібы прэлюдыяй да паходу на Ноўгарад.

На дапамогу пскавічам з Ноўгарада выйшла войска князя Мсціслава, сына кіеўскага Ізяслава Яраславіча. Паводле Наўгародскага І

---

каганата. Пасля разгрому каганата ў X стагоддзі на месцы Таматарха ўзнік Тмутаракань — цэнтр княства, буйны гандлёвы горад з выдатнай марской гаванню.

летапісу, Усяслаў разбіў яго на рацэ Чарэсе і, відаць, без асаблівых цяжкасцяў. Бо, мяркуючы па тым, як уцякаў з Ноўгарада Расціслаў, новы кіеўскі стаўленік не мог карыстацца ў горадзе падтрымкай, а таксама разлічваць на апалчэнне. Супроць Усяслава ён, хутчэй за ўсё, выступіў толькі са сваёй уласнай абмежаванай дружынай. Таму быў разбіты і пабег не назад, у Ноўгарад, а да бацькі ў Кіеў. Шлях на Ноўгарад быў адкрыты.

Але полацкі Чарадзей не спяшаўся нападаць на Ноўгарад. Паводле «Аповесці мінулых часоў», ён адступіў ад Пскова, а паводле Акадэмічнага летапісу, спыніўся ў Копысі, дзе стаў збіраць новае войска. Мы не можам пагадзіцца з думкаю некаторых даследчыкаў, што пасля аблогі Пскова Усяслаў рушыў на Ноўгарад, а ў 1067 годзе — на Навагародак, адкуль і спяшаўся на знакамітую бітву на Нямізе. Для гэтага ёсць падставы. Пасля аблогі Пскова і выгнання Мсціслава з Ноўгарада логіка падказвала, што будзе адпаведная рэакцыя братоў-трыумвіраў. Усяслаў чакаў войска з боку Кіева, а таму і перабраўся ў Копысь, каб сустрэць ворага на мяжы свайго княства і не дапусціць яго да Полацка. З другога боку, спрыяючы аднаўленню справядлівасці, ён чакаў, што ў Ноўгарад вернецца законны князь — Расціслаў, які збег «у эміграцыю», у Тмутаракань.

Але Яраславічы ў той год не адважыліся на адкрытую сутычку з Усяславам. Бо калі войскі апошняга збіраліся на поўначы Кіеўшчыны, то войскі Расціслава пагражалі з поўдня. Былы наўгародскі князь моцна трымаўся за Тмутаракань. Ён абклаў данінай стэпавікоў касогаў, кантраляваў найважнейшы шлях з поўдня ва Усходнюю Еўропу. І раптам у 1066 годзе ў часе балю катапан — намеснік візантыйскага імператара — падсыпае ў кубак Расціслава атруту. Гісторыкі не сумняваюцца, што гэта адбылося не без дапамогі Яраславічаў, бо апошнім гэта было вельмі выгадна. Яны нібы адразу забівалі двух зайцоў: пазбаўлялі Ноўгарад патэнцыяльнага і законнага князя, а Усяслава Полацкага — магутнага хаўрусніка. Гэткая подласць не магла застацца па-за ўвагай Чарадзея. Тым больш што адразу пасля смерці Расціслава трыумвір Святаслаў пасадзіў у Тмутаракані свайго сына Глеба. Відаць, тое ж самае збіраўся зрабіць у Ноўгарадзе Ізяслаў для свайго сына. Таму, апярэджваючы сваіх ворагаў, Усяслаў Брачыславіч у 1067 годзе рушыў на Ноўгарад. Але, відаць, трохі спазніўся. Там ужо Мсціслаў паспеў заняць князеўскі пасад. Магчыма, таму аблога і захоп Ноўгарада былі жорсткія і крывавыя.

Паводле летапісу, Усяслаў захапіў Ноўгарад і спаліў яго да Нераўскага канца, захапіў у палон жанчын і дзяцей, паздымаў з наўгародскай Сафіі званы і панікадзілы. У апошнім, вядома, можна сумня-

вацца, ведаючы, як зычліва ставіліся да Чарадзея розныя святары. Але ж пра гэта паведамляюць самі наўгародскія летапісы і вельмі падрабязна. На нашу думку, будаўніцтва храма ў Полацку і адначасовае рабаванне святой Сафіі ў Ноўгарадзе пры ўсёй супярэчнасці адпавядала няўстойліваму хрысціянска-паганскаму веравызнанню Усяслава. Ён быў хрысціянінам больш па неабходнасці, чым па перакананні, і паганцам у душы. А таму яго сумленне дазваляла рабаваць чужыя храмы.

Захопам Ноўгарада Усяслаў «разбіў славу Яраслава», як апавядае «Слова...», бо менавіта Ноўгарад доўгі час лічыўся апорай Яраслава Мудрага, адпаведна — і яго нашчадкаў. Наперадзе Усяслава чакала цяжкое выпрабаванне — НЯМІГІ КРЫВАВЫЯ БЕРАГІ.

«Яраславічы тры — Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад,— сабраўшы разам войскі свае, рушылі на Усяслава, калі была вялікая зіма, і прыйшлі да Менска. А менчукі зачыніліся ў горадзе, і браты ўзялі Менск, забілі мужчын, а жонак і дзяцей забралі ў здабычу і пайшлі да Нямігі. Усяслаў таксама выступіў супроць, і, сустрэўшыся на Нямізе месяца сакавіка ў трэці дзень, пайшлі яны адны супроць другіх. І быў снег вялікі, і была сеча лютая, і загінулі многія. І перамог Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, а Усяслаў уцёк».

Вось такі, на першы погляд, зусім невялічкі ўрывак летапісу апавядае пра адну з самых крывавых, самых вялікіх бітваў паміж Полацкай і Кіеўскай землямі. Колькі жыццяў, колькі лёсаў чалавечых забрала Няміга! Колькі загінула іх, безабаронных, пад сценамі Менска, колькі пасля — у чужынскіх палонах, на нявольніцкіх рынках Кіева і Візантыі. Палонных жанчын і дзяцей у тыя часы бралі не для працы на гаспадарцы — ад дужых мужчын куды больш было б карысці! Жанчын і дзяцей забіралі ў палон, каб пасля праз Корсунь і Кіеў прадаць у рабства на Усход.

Гэтая бітва была адной з самых жудасных на некалькі стагоддзяў. Нават на канцы XII стагоддзя аўтар «Слова...» прыгадвае яе з болем і горыччу:

> На Нямізе галовы сцелюць снапамі,
> харалужнымі малоцяць цапамі,
> жыццё кладуць на таку злюцела,
> веюць душу ад цела.
> Нямігі крывавыя берагі
> не збожжам былі засеяны зноў —
> засеяны косцьмі рускіх сыноў.[1]

[1] Слова пра паход Ігаравы / Пер. Р. Барадуліна. Мн., 1986. С. 144.

Сучасныя гісторыкі слушна лічаць, што ход падзей быў такі. Спачатку аб'яднанае войска Яраславічаў падышло да Менска (тады ён знаходзіўся на рацэ Менка за 16 кіламетраў на захад ад сучаснага горада), захапіла і рушыла на Нямігу. Няміга, як паказваюць шматгадовыя даследаванні, гэта назва не толькі ракі, але і дзядзінца, збудаванага ў сутоцы Нямігі і Свіслачы. Пазней сюды быў перанесены Менск.

Адсюль становіцца зразумелым шлях Яраславічаў. Цераз залежныя ад іх княствы, Тураўскую зямлю, па дарозе на Полацк яны натрапілі спачатку на Менск, пасля на Нямігу.

Усеваладу не ставала часу на адпачынак. Хуткія перамяшчэнні былі характэрныя для Чарадзея. На Ноўгарад Усяслаў напаў недзе пасля смерці Расціслава тмутараканскага, г. зн. пасля 3 лютага 1067 года. А роўна праз месяц, 3 сакавіка, ён ужо на Нямізе. Дзіўна? Вядома, але не толькі для нас. Нечаканае з'яўленне Усяслава пад Нямігай, відаць, не менш здзівіла і Яраславічаў. Іначай, ведаючы, што Усяслаў недзе побач пад Новагародкам, не сталі б абкладаць і браць прыступам Менск.

Трыумвіры ж ішлі насустрач Усяславу павольна, рабуючы і спальваючы па дарозе гарады. Яны спадзяваліся, што полацкі князь будзе доўга цягнуцца да Полацка з наўгародскім абозам, а толькі пасля пойдзе ім насустрач. Але адбылося іначай.

Гэта была жорсткая, крывавая бітва. Можна ўявіць, як глыбокім вясновым снегам сыходзяцца дзве конніцы. Цяжка дыхаючы, коні па крыж правальваюцца ў снезе. Там, дзе выбіваюцца на пагоркі, услед імкліваму алюру цягнуцца матавыя заслоны снегавога пылу. Скрыгат жалеза, енкі, баявыя заклікі, гук ражкоў. На бялюткім да болю ў вачах снезе расцякліся ярка-чырвоныя плямы, быццам пакінутыя харугвы Усяслава.

Палачане адступілі. Але яны не былі пераможаныя, як не былі пераможцамі і Яраславічы. Войскі разышліся ад таго месца, дзе і сустрэліся. Загінула столькі вояў, што ні біцца далей, ні даганяць адступіўшых ні ў кога не было моцы. Летапіснае «Усяслаў збег» не што іншае, як канстатацыя факта: Усяслаў першы «прыбег» да Нямігі і першы ад яе пайшоў. Самым яскравым доказам безвыніковасці для абодвух бакоў бітвы на Нямізе (а ў першую чаргу для братоў-трыумвіраў) стала тое, што ўжо праз чатыры месяцы Яраславічы запрасілі Чарадзея на перамовы.

Пасля бітвы на Нямізе Яраславічы не адважыліся ісці на Полацк. Па звестках таго ж В. Тацішчава, яны «спустошылі» Полацкую воласць. Але не думаем, што гэта было вялікае спусташэнне для

Полаччыны. Шлях іх ляжаў у бок Смаленска, па самым поўдні полацкіх земляў, нават не кранаючы такіх гарадоў, як Копысь, Друцк, ды, відаць, самой Оршы. Летапіснае паведамленне аб перамовах князёў «на Ршы ля Смаленска» варта тлумачыць не як пад горадам Оршай, а на рацэ Ршы, бліжэй да Смаленска. А гэта, уласна кажучы, ужо землі Смаленскага княства, а не Полацкага. Тое, што князі дамаўляліся сустрэцца на мяжы дзвюх земляў,— не толькі абавязковая ўмова дыпламатычнай сустрэчы. Магло так здарыцца, што Яраславічы пасля сустрэчы на Нямізе проста не адважваліся парушыць межы Полацкай зямлі. Гэта вынікае і з таго, што яны першымі паклікалі да сябе Усяслава: «Цалавалі крыж чэсны Усяславу, казалі: «Прыйдзі да нас, а мы не зробім табе блага».

Усяслаў, спадзеючыся на крыжацалаванне, пераплыў у чоўне Дняпро разам з двума малалетнімі сынамі. Калі Усяслаў зайшоў услед за Ізяславам у шацёр, яго схапілі. Разам з сынамі як вязня павезлі ў Кіеў і засадзілі ў турму-поруб.

Клятваадступніцтва Яраславічаў — яскравы доказ вераломнай палітыкі Кіева, які не грэбаваў ніякімі метадамі. Вядомае выслоўе, што ўсе сродкі добрыя ў дасягненні мэты, можна лічыць дэвізам трыумвіраў на працягу ўсёй іх дзейнасці. Перамовы «на Ршы» не адбыліся. Але і падступнасць Яраславічаў не мінулася ім.

У наступным 1068 годзе на паўднёвыя кіеўскія землі абрынуліся незлічоныя орды полаўцаў. Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад выйшлі ім насустрач. Але былі разбітыя. Следам за гэтым паведамленнем у летапісе ідзе «Павучанне аб кары божай», якое прыпісваецца Феадосію Пячэрскаму — ігумену, духоўнаму саюзніку Усяслава. Яно накіравана супроць клятваадступнікаў, г. зн. Яраславічаў, якія парушылі крыжацалаванне.

Усяславу было наканавана прасядзець разам з сынамі ў порубе 14 месяцаў і 5 дзён замест пажыццёвай няволі, як меркавалі Яраславічы. Разбітыя на Альце «за грахі», тры браты пабеглі хавацца ў свае гарады: Святаслаў — у Чарнігаў, а Ізяслаў разам з Усеваладам і рэштаю дружыны прыйшлі да Кіева. Палавецкая пагроза заставалася, а таму кіяўляне сабраліся на веча на гандлёвым пляцы кіеўскага Падола і там патрабавалі ад князя Ізяслава коней і зброю. Князь адмовіў. Тады натоўп з Падола рушыў на двор ваяводы Каснячкі і разрабаваў яго. Па тым, як Каснячка збег, калі да яго прыйшлі гараджане, можна меркаваць, што гэтак: жа баязліва ён паводзіў сябе і на Альце.

Але вось «выпадкова» абураны натоўп апынуўся каля дворышча Брачыслава, таго самага, якое было заснавана бацькам Усяслава

Чарадзея. Зараз гэта быў не толькі гандлёвы полацкі двор у Кіеве, але і своеасаблівае «прадстаўніцтва» палачан на Кіеўшчыне. Тут, каля Брачыслава дворышча, і ўзнікла думка: «Пойдзем, высадзім дружыну са склепа» — вызвалім Усяслава з поруба-турмы. Натоўп падзяліўся на дзве часткі: адна пайшла да поруба, другая — па «мосце», вымашчаным насціле, на князёў двор.

Чаму ідэя вызвалення Усяслава з поруба ўзнікла не на Падоле, дзе гэты поруб знаходзіўся, а толькі каля двара Брачыслава? Чаму толькі каля полацкага двара бунтаўшчыкі падзяліліся на дзве часткі? Адказаць на гэтыя пытанні можна, калі ў якасці верагоднага факта дапусціць, што адразу пасля адмовы Ізяслава бунтаўшчыкоў накіроўвала нечая моцная рука. Карысці ад пошукаў Каснячкі не было ніякай. Кіяўляне проста разрабавалі яго двор, адпомсціўшы такім чынам за яго ранейшыя справы. Але ад таго, што натоўп апынуўся тут, былі дзве карысці. Па-першае, згодна з псіхалогіяй натоўпу які ўсё пачаў біць і ламаць, адным дваром ён, безумоўна, не мог задаволіцца. Па-другое, побач з дваром Касцячкі быў двор Брачыслава. І не выпадкова, што менавіта тут адбылася нарада, якая вырашыла ход усіх далейшых падзей.

З гэтага можна зрабіць выснову, што на двор Каснячкі, бліжэй да Брачыслава дворышча кіяўлян прывялі тыя, хто быў зацікаўлены ў вызваленні вязня. Тут, на Брачыслававым дворышчы людзей было прасцей з'агітаваць на карысць полацкага князя. Зрабіць гэта мог хто-небудзь з палачанаў, хоць, праўда, гэта малаверагодна. Людзі, тым больш кіяўляне, маглі паслухацца толькі добра вядомага ім чалавека. Ёсць падставы меркаваць што такім чалавекам з'явіўся ігумен Кіева-Пячорскага манастыра Феадосій. Чаму менавіта ён, скажам пазней.

Акрамя таго, толькі пасля рады на полацкім дворышчы паўстанне набыло адкрыты антыкнязеўскі характар. Гараджане рушылі да князеўскага харама, які, безумоўна, ахоўваўся дружынаю. Паўстае пытанне: а ці не з'явілася ў іх зброя ўжо пасля наведання Брачыслава дворышча? Хоць там яе магло быць не так і шмат, але дастаткова, каб узброіць адну частку натоўпу і павесці яе на князевы палаты. Другая ж частка пайшла вызваляць «дружыну сваю» — сваіх сяброў. Можна не сумнявацца што гэтую палову натоўпу ўзначалілі палачане.

Поруб імгненна быў раскіданы па бярвенцы. З цёмнага, паўзакапанага ў зямлю збудавання з маленькімі акенцамі, праз якія падавалі ежу, пад радасныя крыкі натоўпу выйшаў на свет Усяслаў з сынамі.

Тым часам у князеўскім хораме развіваліся не менш драматычныя падзеі. Кіеўскі князь Ізяслаў радзіўся са сваёй дружынаю. Першы раз Тукы брат Чудзіна, параіў Ізяславу пасланць «сцерагчы» полацкага вязня[1]. На другі раз парада сталася больш акрэсленая — паклікаць да акенца і працяць мячом. Але Ізяслаў не паслухаўся. Чаму?

Можна растлумачыць проста: не паспеў, Усяслава ўжо вызвалілі з поруба. Але гэта, на нашу думку, не зусім так. Усё значна складаней. Д. Ліхачоў адзначыў, што 15 верасня (калі Усяслава вызвалілі з поруба) — другі дзень царкоўнага свята Узвіжання. Святы, у тым ліку і гэтае, прысвячаліся перамозе дабра над злом, і парушыць крыжацалаванне было вялікім грахом. Менавіта апошняе і зрабіў Ізяслаў на Ршы, таму ў гэты дзень і прыйшла расплата. Але і гэта не ўсё. 10 чэрвеня, калі Яраславічы схапілі полацкага князя з сынамі, ішлі пасляВелікодныя святы. Гэта было якраз напярэдадні другога свята — нараджэння Іаана Хрысціцеля. Парушаць клятву крыжацалавання наогул вялікі грэх, а ў такія дні — тым больш. Вось чаму 15 верасня 1068 года, на другі дзень свята, Ізяслаў не адважыўся на забойства.

«Людзі ўзнялі лямант і пайшлі да поруба Усяслава. Ізяслаў жа, убачыўшы гэта, разам з Усеваладам пабеглі з двара. Людзі высеклі Усяслава з поруба ў пятнаццаты дзень верасня і паставілі яго <князем> пасярод князева двара. А двор князеўскі разрабавалі — незлічоную колькасць золата і серабра і кунамі і футрам. Ізяслаў жа ўцёк у ляхі».

Выгнанне гараджанамі аднаго князя, вызваленне з поруба і «ўхвала» другога — падзеі экстраардынарныя ў тагачасным грамадстве. Па многіх прычынах яны запомніліся на стагоддзі. Па гарачых слядах падзей 15 верасня летапісец запісаў: «А се бог явіў хрэсную Сілу, бо Ізяслаў, цалаваўшы крыж, схапіў яго Ўсяслава). І праз тое навёў бог паганых, а гэтага яўна пазбавіў крыж чэсны, бо ў дзень Узвіжання Усяслаў... сказаў: «О крыж чэсны! Колькі я ў цябе верыў, вызвалі мяне ад ямы гэтай».

Тыя ж падзеі, але ўвасобленыя ў мастацкім слове, пакінуў нашчадкам аўтар «Слова...»:

На сёмым веку Траяна
кінуў жэрабя Усяслаў маўкліва
  на любую сваю абраную.
Ды хітрасцю асядлаў коней рана
і скочыў да горада Кіева
і дакрануўся дзідаю

[1] Д. Ліхачоў дапускае, што слова «сцерагчы» азначала нават «забіць» (Знание — сила. 1983. № 4 С. 30).

да залатога прастола кіеўскага.

Нядоўга было наканавана Усяславу сядзець на «залатым пасадзе» — усяго сем месяцаў.

Што адбывалася ў тыя сем месяцаў летапісы маўчаць. Маўчыць і «Слова...» Напэўна, Усяслаў даў гараджанам і коней, і зброю. Напэўна, жыў у згодзе з людзьмі кіеўскімі і мудра кіраваў. Акадэмік Б. Рыбакоў мяркуе, што ў гэты час Усяслаў ездзіў у Тмутаракань, каб набраць войска для разгрому полаўцаў[1]. Але, як адзначыў і сам акадэмік, дагэтуль застаюцца неразгаданымі словы: «Усяслаў-князь... з Кіева паспяваў да пеўняў да Тмутараканя, Хорсу вялікаму шлях перацінаў».

Загадка Тмутараканя прывяла і мяне аднойчы ў гэты старадаўні славуты горад... Праўда, ні высокіх сцен, ні валаў колішняга горада я не ўбачыў. Рэшткі апошніх, ледзь заўважныя, засталіся толькі з заходняга боку гарадзішча. Але само гарадзішча займае плошчу каля 36 гектараў. На працягу многіх гадоў тут вядуцца археалагічныя раскопкі. Пад час раскопак былі знойдзены сядзібы часоў Хазарскага каганату і Кіеўскай Русі. Сярэднія памеры будынкаў — 5х6 метраў. Вось толькі муроўка будынкаў позняга перыяду была незвычайная — вапнавая рошчына з бітай цэглы. Адразу ж прыгадалася паралель: гэта ж тая цамянка, якой замацоўваліся цагліны-плінфы Сафійскіх сабораў, у тым ліку і ў Полацку. Паказалі мне некалькі цікавых амфар — амаль поўныя копіі тых, што знойдзены пад час археалагічных раскопак у Полацку. Дарэчы, у Полацку намі быў знойдзены пляскаты бранзалет з сіняга шкла з залатой размалёўкай. Падобныя бранзалеты спецыялісты далучаюць да тмутараканскага тыпу.

Тмутаракань X-XI стагоддзяў — буйны горад, з пераважна хазарскім насельніцтвам. Славянаў тут зусім мала, відаць, у асноўным гандляры, нейкая частка — дружына славянскага князя. Для абароны з боку стэпу былі насыпаныя вялізныя валы, якіх у папярэднікаў Тмутараканя ніколі не было. Гэта можна растлумачыць толькі неабходнасцю абароны малымі сіламі. Княства трымалася, відаць, на магутнасці славянскага князя і ягонай дружыны, як, напрыклад, пры Мсціславе Уладзіміравічу (988—1036 гг.), або на супадзенні памкненняў князя і мясцовай знаці — пры Алегу Святаславічу (памёр у 1115 г.), які хадзіў паходамі на паўднёварускія землі. У любым выпадку князь мог заўсёды знайсці ў Тмутаракані неабходную колькасць воінаў, коней і зброі, а таксама палітычную падтрымку з боку стэпавікоў.

Акрамя таго, Тмутаракань — надзвычай багаты гандлёвы горад. Па значнасці яго можна было б параўнаць хіба што з Корсунем. Але

[1] Рыбаков Б. А. Историзм «Слова о полку Игореве» К 800-летию «Слова о полку Игореве» // Истария СССР. 1985. № 5.

калі праз Корсунь гандаль ішоў па Дняпры, праз Кіеўскія землі, і ва ўладзе кіеўскіх князёў было прапусціць або не гандлёвы караван, то ад Тмутараканя — па Волзе, Доне напраскі ў бок Полацка.

Ці не для таго, каб сцвердзіць свой уплыў і забяспечыць надалей трываласць для Полацка гэтага шляху, «паспяваў да пеўняў» Усяслаў у Тмутаракань? Магчыма, але не толькі дзеля гэтага.

Раней мы казалі, як у Тмутаракань збег наўгародскі князь Расціслаў і як там быў атручаны не без дапамогі Яраславічаў. У 1066 годзе князь Глеб, сын Святаслава чарнігаўскага — трыумвіра, заняў тмутараканскі стол адразу пасля забойства Расціслава. Да нас дайшоў цікавы помнік старажытнай эпіграфікі — камень з надпісам, адпаведна якому Глеб мераў шырыню Керчанскага праліва ў 1068 годзе[1]. «У лета 6576 індыкта 6 Глеб князь мераў мора па лёдзе ад Тмутараканя да Корчава (10000 і 4000 сажняў)».

Дата на камені пастаўлена па вераснёўскім ліку гадоў і павінна адпавядаць верасню 1067 — жніўню 1068 года. А паколькі прамер адбываўся ўзімку, то снежню 1067 — студзеню 1068 года[2]. Прамер праліва меў на мэце пісьмова сцвердзіць уладу Глеба на тмутараканскі стол, на заходнюю і ўсходнюю часткі княства[3]. Але дзіўна, што, так грунтоўна заснаваўшыся ў Тмутаракані, князь ужо ў 1069 годзе зноў апынуўся на наўгародскім пасадзе. Паўстае пытанне: чаму? Ці не таму што ў верасні 1068 года Кіеўскім князем становіцца Усяслаў Чарадзей? Традыцыйна лічыцца, што Тмутаракань належаў Чарнігаўскаму княству. У пэўнай ступені гэта так. Але з 1068 да 1078 года пра гэты горад няма ніводнай звесткі.

Глеб з Тмутараканя збег. Ці мог горад заставацца без князя ажно дзесяць гадоў? Відаць, не. Меркаваць, што ў гэтым часе горад і княства цалкам былі адрэзаны полаўцамі, а то і захоплены імі[4], няма няма падстаў, бо інакш у 1078 годзе рускія князі, бадай, не змаглі б так хутка і проста там усталявацца. Відаць, у Тмутаракані тады сядзеў адзін з прыхільнікаў палітыкі Усяслава Чарадзея Не абавязкова князь, мог быць і яго намеснік. Але дзякуючы гэтаму у 1078 годзе Тмутаракань стаў прытулкам новай групы князёў, незадаволеных цэнтрысцкай палітыкай Яраславічаў. Але пра гэта — далей. Зразумела толькі адно: заняўшы пасад у Кіеве Усяслаў ідзе на Тмутаракань не толькі каб разбіць полаўцаў (гэта ён, відаць, робіць па дарозе) але каб

---

[1] Камень гэты знаходзіцца зараз у Ленінградзе, у фондах Эрмітажа.
[2] Рыбаков Б. А. Русские датированные надписи XI—XIV Свод археологических источников. М., 1964. Е-144 С. 17.
[3] Медынцева А. А. Тмутараканский камень. М., 1979., с. 15.
[4] Греков Б. Д. Киевская Русь. Л., 1953, С. 470.

выгнаць з горада свайго даўняга ворага — Глеба і такім чынам усталяваць справядлівасць.

Што было ў наступныя месяцы, як кіраваў Чарадзей у Кіеве, — мы не ведаем, але ягоны вораг — выгнаны Ізяслаў — не драмаў. Паводле выказвання акадэміка Б. Грэкава “Ізяслаў здраджваў інтарэсам Русі, шукаў дапамогі ў Заходняй Еўропе». І гэта было сапраўды так. Па. дапамогу Ізяслаў найперш кінуўся да свайго стрыечнага брата — польскага караля Баляслава Харобрага. Не задарма ён прасіў дапамогі — у плату прапанаваў родную зямлю і Кіеў. Адмовіцца ад такой узнагароды Баляслаў не мог. Сабраўшы вялікае войска, разам рушылі на Кіеў адстойваць «справядлівасць».

Насустрач гэтаму войску з Кіева ў бок Белгарада выйшла войска на чале з Усяславам. «І прыйшоў Усяслаў да Белгарада, а калі настала ноч, ён употай ад Кіян уцёк з Белгарада да Полацка»

Скочыў ад іх лютым зверам
апаўночы з Белграда,
сінім воблакам ахінуўся.

Нечаканая развязка адбылася на канцы Усяслававa княжання ў Кіеве. Дагэтуль ніхто не змог пераканаўча растлумачыць, чаму Чарадзей добраахвотна адмовіўся ад такога прэстыжнага княжання.

М. Ермаловіч тлумачыць гэта варожасцю, якая ўзнікла ў кіеўскім баярскім асяроддзі да князя, абранага «чорным людам». Маўляў, ён ішоў ім насустрач насуперак заможным гараджанам[1]. Д. Ліхачоў, абапіраючыся на радкі са «Слова...»:

Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана
у званы ў святое Сафіі,
а ён той звон чуе ў Кіеве,—

кажа, што ў князя прачнулася сумленне за знятыя калісьці з наўгародскай Сафіі званы. Менавіта яны зараз даносілі да Чарадзея свой звон ад Полацка да Кіева. Усяслаў быў аднолькава чужы як для простых гараджанаў, якія паўсталі, так і для феадальных вярхоў Кіева[2].

Відаць, абодва даследчыкі маюць рацыю. Але прычыны тут, мабыць, складанейшыя. Будучы адначасова і кіеўскім, і полацкім князем, Усяслаў не мог пазбегнуць таго, супроць чаго выступаў усё жыццё — цэнтрысцкай палітыкі. Воляй лёсу ён апынуўся перад вельмі складаным выбарам: як адначасова быць князем двух княстваў, фактычным валадаром больш чым паловы ўсходнеславянскай зямлі, і разам з тым не канфліктаваць з іншымі князямі. Ён, які абараняў

[1] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 131.
[2] Лихачев Д. С. «Слово о полку Игореве» и культура его времени. Л., 1985. С. 97.

самастойнасць Ноўгарада і Смаленска, Полацка і Тмутараканя, раптам стаў адзінаўладным гаспадаром агромністых земляў. Усяслаў меў ускоснае права на Кіеў, але яно было настолькі адноснае, што сам ён ніколі не імкнуўся яго ажыццявіць. Чарадзея падтрымалі кіяўляне, але гэты эмацыянальны парыў у значнай ступені быў падагрэты самімі палачанамі. Дзе гарантыя, што падобнае не паўторыцца і ён зноў не апынецца ў порубе? Пад час сямімесячнага княжання Усяслаў зблізіўся з манахамі Кіева-Пячорскага манастыра. Як мы казалі вышэй, на яго баку выступілі Феадосій і Антоній Пячэрскія. Усяслаў для іх быў значна бліжэйшы, чым пракаталіцка настроены Ізяслаў. Менавіта яны маглі абудзіць у князя сумленне, пакаянне за колішнія грахі — хоць бы тыя ж наўгародскія званы. І урэшце, адвечнае чалавечае пытанне. «Хто я? Якой зямлі сын?»

На працягу ўсёй гісторыі мы назіраем у полацкіх князёў абвостранае пачуццё радзімы, бацькаўшчыны. Не магло яно абмінуць і Усяслава. Зразумела што пачуцце — не навуковы доказ. Але, не ўлічваючы агульначалавечых каштоўнасцяў, людской маралі, мы ніколі не зможам да канца зразумець сваёй гісторыі.

Вось чаму князь-пярэварацень, шчаслівец і пакутнік імчыць на родную зямлю — Полаччыну.

Дружына спіць, дык Волх не спіць.
Ён абернецца шэрым воўкам,
Бегае, скача па цёмных лясах і кустоўі
А б’е ён звяроў рагатых,
Ды і воўку, мядзведзю спуску не дае.

Але і там не знайшоў Чарадзей спакою. У тым жа годзе Ізяслаў прымусіў бегчы яго з Полацка. Адбылося гэта па некалькіх прычынах. Па-першае, Усяславу не было часу збіраць войска, каб даць праціўніку адпор. Па-другое, паводле некаторых крыніц, на Полацк рушыла добра ўзброенае польскае войска. Магчыма, што на чале яго ішоў сын Ізяслава — Мсціслаў, які і заняў стол у Полацку.

У тым жа годзе Мсціслаў нечакана памёр. Відаць, у смерці гэтага юнака, які быў у поўным росквіце сіл, не абышлося без атруты і “дапамогі” саміх палачанаў. На месца Мсціслава сеў яго брат Святаполк. Але і таму было наканавана сядзець не болей за год. Усяслаў не губляў марна часу.

## РАДЗІМА Ў КОЖНАГА СВАЯ

*Вяртанне і выгнанне * Помста за знявагу * «Адпусцілі дзеля Бога» * Пагоня за пагоднымі коньмі * Рэха Тмутараканя * Меч хаваецца ў похву*

Выгнаны з Полацка Усяслаў шукаў падтрымкі. Цяпер, як ніколі, яму спрыяла рознаэтнічнасць Полацкай зямлі. Мы ўжо казалі, якія народы насялялі княства і якую палітыку на аб'яднанне гэтых народаў праводзіў Усяслаў. Зараз яму спатрэбіліся добрыя суседскія сувязі і пагалоска прыхільніка паганскіх абрадаў. Тым часам на Наўгародчыне наспявала паўстанне вешчуноў.

Паводле Наўгародскага I летапісу, Усяслаў уцёк да фінскага племя водзі. Як адзначаў М. Ермаловіч, туды ён збег да сваякоў па лініі маці.

23 кастрычніка 1069 года ў пятніцу ў 6 гадзін пад Ноўгарадам з'явілася водскае войска на чале з Усяславам Чарадзеем. Хто каго падбухторыў на гэты паход — Усяслаў водзь ці валжане Усяслава — невядома. Пайсці разам з ваджанамі на Ноўгарад у Чарадзея былі свае падставы. Па-першае, Ноўгарад — старадаўні вораг Полацка, адкуль заўсёды была пагроза, па-другое, у горадзе тым часам сядзеў яго зацяты вораг — князь Глеб. Той самы Глеб, якога Усяслаў выгнаў з Ноўгарада ў 1066 годзе, а пасля з Тмутараканя ў 1068-1069 гадах. Па-трэцяе, у 1069 годзе ў Ноўгарадзе з'явіўся вяшчун, які выступіў супроць наўгародскага епіскапа Фёдара.

Мяркуючы па летапісным сказе: «... князь жа Глеб і дружына яго сталі каля епіскапа, а людзі ўсе ішлі за вешчуном» — большасць насельніцтва падтрымала вешчуна. Князь і епіскап засталіся фактычна ў адзіноце. Убачыўшы такое становішча, наўгародскі князь узяў пад кашулю сякеру і падышоў да вешчуна. Пасля кароткай паміж імі размовы Глеб выхапіў сякеру і засек вешчуна. Той упаў мертвы, а людзі разышліся.

Вось такое складанае становішча было ў той час у Ноўгарадзе, калі на яго з водскім войскам рушыў Усяслаў Чарадзей.

Як прыхільнік у нейкай ступені паганскіх звычаяў, Усяслаў не мог не разумець, што ў Ноўгарадзе для яго спрыяльныя ўмовы. Магчыма нават, што ён ішоў на дапамогу тым самым наўгародскім вешчунам, з'яўленне якіх сам і справакаваў. Гэтая дапамога, абарона старой рэлігіі, магла быць «ідэалагічным» абгрунтаваннем і для саміх ваджан. Але, безумоўна, апошніх перадусім павінны былі цікавіць

незлічоныя наўгародскія каштоўнасці і здабыча. Адзінае, што пэўна можна сцвярджаць, дык гэта тое, што Усяслаў не імкнуўся захапіць Ноўгарад. Бо не горад быў для яго небяспекай, а князь Глеб сын чарнігаўскага Святаслава-трыумвіра. Тым больш што Святаслаў, які сядзеў тады ў Полацку, даводзіўся Глебу стрыечным братам. Як бы там ні было, але ў 6 гадзін 26 кастрычніка войска князя Глеба сустрэлася з войскам Усяслава каля Зверынца на рацэ Гзені. Для наўгародцаў гэтая сустрэча не была нечаканая, а таму абодва войскі амаль адразу ўступілі ў бітву. Як апавядае летапісец, «ваджанам была вялікая сеча і загінула іх шмат без ліку». Князь Усяслаў трапіў у палон. Але яго адразу ж адпусцілі «дзеля Бога», што надзвычай цікава.

Да гэтага часу гісторыкі асабліва не зважалі на гэты факт. Чаму Усяслава адпусцілі? На нашу думку, не слава пакутніка, не слава ўдачлівага ваяра і нават пярэваратня-ваўкалака, прыхільніка старых паганскіх звычаяў, імпанавала наўгародцам. Па ўсіх гарадах Усходняй Еўропы ўсё большы аўтарытэт заваёўвала палітычная пазіцыя полацкага князя. Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што ў XII-XIII стагоддзях мы паўсюдна назіраем надзвычай высокую актыўнасць гарадскога веча — органа гарадскога самакіравання. Веча — гэта шлях да незалежнасці гарадоў, палітычнай і эканамічнай іх самастойнасці. У XII-XIII стагоддзях веча ў Полацку, Ноўгарадзе, Пскове запрашае і выганяе князёў. Гарады, воласці, землі больш не залежаць ад цэнтра, у прыватнасці ад Кіева. У гэтыя стагоддзі адбылося тое, што прапаведаваў і адстойваў у сваёй палітыцы Усяслаў Чарадзей. Пад Ноўгарадам у 1069 годзе ён з'явіўся як князь, упершыню абраны на вялікі князеўскі пасад народам — вечам. Пасля яго ў розных гарадах было безліч розных князёў, але Усяслаў быў першы! Адсюль і вялікі, ні з чым не параўнаны яго аўтарытэт і міласэрнасць да яго з боку наўгародцаў. Менавіта народа, бо паверыць у тое, што Усяслава добраахвотна адпусціў ягоны заціяты вораг Глеб Святаславіч, цяжка.

Пасля паражэння на Гзені імя Усяслава на два гады знікае са старонак летапісаў. Відаць, мы не памылімся, калі скажам, што гэтыя гады Усяслаў знаходзіўся сярод балцкіх плямёнаў. Бо нездарма ж у 1071 годзе мы бачым яго пад Полацкам з войскам літоўцаў, саюзных яму эстаў, ліваў, лептаў і семігалаў[1]. «Выгнаў Усяслаў Святаполка з Полацка», — вось і ўсё, што кажа летапіс. Відаць, гэта была лёгкая перамога, якая тым не менш не абяцала Усяславу лёгкага жыцця.

Князь кіеўскі Ізяслаў не пакінуў усталяванне Чарадзея ў Полацку без увагі. Барацьбу з Усяславам узначаліў брат Святаполка, старэйшы

---

[1] Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896. С. 68.

сын Ізяслава — Яраполк. У 1071 годзе Яраполк разбівае Усяслава пад Галацічаскам[1]. Але гэтая перамога не мела істотных вынікаў ні для Полацка, ні для Кіева. Адбылося прыкладна тое, што і пасля бітвы на Нямізе. У Яраполка не хапіла моцы, каб ісці вяртаць Кіеву Полацк, а ва Усяслава проста не было патрэбы ісці на Кіеў ці за межы свайго княства.

І зноў пра Усяслава Полацкага на старонках летапісу пустата-лакуна на два гады. Чым ён тады займаўся — цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё папраўляў справы сваёй зямлі, значна парабаванай у часе кіравання кіеўскіх наменікаў. Збіраў войска, зброю, бо не было ўпэўненасці, што пакінуць яго ў спакоі. Ускосным сведчаннем яго дзейнасці і ўмацавання можа быць тое, што ў 1073 годзе пайшла пагалоска, што Ізяслаў кіеўскі наладжвае нейкія сувязі — «сватаецца» да Усяслава. Крыніцай гэтай пагалоскі выступае князь Святаслаў чарнігаўскі, які спрабуе пераканаць у праўдзівасці чутак свайго брата Усевалада, заклікае яго выступіць супроць Ізяслава. Быццам бы кіеўскі князь з дапамогай Усяслава Чарадзея хацеў далучыць да сваіх уладанняў Ноўгарад, дзе тым часам сядзеў на стале сын Святаслава — Глеб.

Памкненні да старшынства з'явіліся і ў Святаслава чарнігаўскага, бо Чарнігаўскае княства, гэтак сама, як і Полацкае, вельмі рана праявіла імкненне да самастойнасці[2]. Славуты трыумвірат Яраславічаў спыніў сваё існаванне. «Ізяслаў жа пайшоў у ляхі з дабром многім і з жонкаю, спадзеючыся на багацце вялікае і кажучы: «Гэтым знайду я вояў...» А Святаслаў сеў у Кіеве, прагнаўшы брата свайго <і> пераступіўшы запавет бацькі, тым больш — і божы».

27 снежня 1076 года ў Кіеве памёр Святаслаў На яго месца сеў брат Усевалад. З гэтага часу зноў скончыліся для Полацка часы мірнага развіцця. Над землямі Кіева, Чарнігава, Уладзіміра ўсталявалася адзіная ўлада ў вобразе апошняга з трыумвіраў і ягоных нашчадкаў, сярод якіх найвялікшую актыўнасць выявіў Уладзімір Манамах. Але да часу непасрэднага адзінаўладдзя заставалася два гады, калі ўся Усходняя Еўропа моцнымі, рашучымі дзеяннямі паказала сваё памкненне да самастойнасці і незалежнасці ў выглядзе стварэння асобных княстваў-дзяржаў.

Хто ведае, можа, працэс паступовага ўтварэння самастойных дзяржаў ішоў бы больш лагодна і мірна, каб асобныя князі не праяўлялі вялікадзяржаўных памкненняў. На жаль, характар улады князёў, асабліва кіеўскіх, набліжаўся да інстытута манаршай улады.

---

[1] Верагодна, летапісны Галацічаск знаходзіўся на месцы сучаснай вёскі Голацк, што ў Пухавіцкім раёне, за 30 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Менска.

[2] Тихомиров М. Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 340.

Такі орган дэмакратычнага самакіравання, як веча, у канцы XI стагоддзя толькі набіраў сілу. Не дзіва, што наступная згадка веча ў Кіеве пасля 1068-1069 гадоў сустракаецца ледзь не праз стагоддзе — у 1146 годзе[1]. А росквіт веча прыпадае на XII-XIII стагоддзі і то пераважна ў Полацкай і Наўгародска-Пскоўскай землях[2]. Таму канцэнтрацыя велікакнязеўскай улады ў руках Усевалада не абяцала Полацку нічога добрага. Усяслаў быў вымушаны рыхтавацца да новых сутычак. Да знешнепалітычнай барацьбы Чарадзей быў заўсёды здатны. Ён імкнуўся праводзіць яе пры дапамозе не толькі зброі, але і дыпламатыі самага высокага ўзроўню. На гэтай ніве Усяслаў мог дасягнуць многага, бо сітуацыя і стаўленне паміж трыумвірамі былі не так заблытаныя, як надта напружаныя.

Ізяслаў, былы кіеўскі князь, які збег «у ляхі» з дзяржаўным скарбам, не губляў часу. Пасля халоднага прыйма Баляславам Харобрым, які не мог дараваць Ізяславу здрады польскім інтарэсам у 1069 годзе, той рэзка змяніў сваю палітычную арыентацыю. Ён паехаў у Майнц, дзе звярнуўся па дапамогу да ворага Баляслава — імператара Генрыха IV. Дарагімі падарункамі «каралю рускіх — Дзімітрыю», як называе хроніка Ізяслава, удалося дамагчыся прыхільнасці імператара. Генрых IV нават накіраваў у Кіеў паслоў з пагрозаю Усеваладу: калі той не верне «Дзмітрыю» яго стол, то «паспытае сілы і магутнасці германскай дзяржавы». Але на чале таго пасольства быў пратапоп трырскі Бухард — родны брат Орды, жонкі аднаго з трыумвіраў — Святаслава. Для Ізяслава візіт тых паслоў скончыўся безвынікова: Бухард вярнуўся з надзвычай багатымі дарамі.

Нядоўга думаючы, Ізяслаў зноў крута мяняе сваю палітыку. Ён пасылае свайго сына Яраполка да першага на той час ворага Генрыха IV — рымскага папы Рыгора VII. Што адбылося паміж папам рымскім і Яраполкам, данеслі да нас матэрыялы Ватыканскага сакрэтнага архіва[3]. Ад імя бацькі Яраполк прасіў папскі двор дапамагчы вярнуць Кіеў і нават даў прысягу, што прызнае папскую ўладу і прыкладзе ўсе намаганні, каб зрабіць гэтыя землі «ленам Св. Пётры». Пра гэта сведчыць папскае пасланне да Ізяслава ад 17 красавіка 1075 года. Праз тры дні папа напісаў яшчэ адзін ліст да польскага караля Баляслава, у якім рэкамендуе таму дапамагчы Ізяславу і вярнуць яму кіеўскі скарб. Ён, відаць, знаходзіўся пад своеасаблівым арыштам.

[1] Фроянов И. Я. Киевская Русь. Л., 1980. С. 167.
[2] Греков Б. Д. Киевская Русь. М., 1953. С. 353—369.
[3] Рамм Б. Я. Папство и Рись в X-XV веках. М.; Л., 1959. С. 66—68.

Але пакуль Ізяслаў налева і направа прадаваў сваю радзіму, у Кіеве памёр Святаслаў. Для прадажнага князя з'явілася магчымасць вярнуцца ў Кіеў.

Безумоўна, Усяслаў Полацкі пільна сачыў за падзеямі ў Кіеве і Заходняй Еўропе. Не толькі таму, што ад палітычнай улады ў Кіеве залежала мірнае развіццё Полаччыны, але і таму, што папскія місіянеры даўно глядзелі на Полацкае княства як на аб'ект сваёй дзейнасці. Свяшчэнная Рымская імперыя паспяхова ажыццяўляла свой націск на ўсход яшчэ з X стагоддзя. Каталіцкая царква ў другой палове X стагоддзя сцвердзіла свой уплыў на землях палякаў, чэхаў, харватаў. Сын Уладзіміра-Хрысціцеля — Святаполк быў жанаты на дачцэ польскага караля. Разам з ёю на «Русь» прыехаў епіскап калабжэгскі Рэйнберн. Магчыма, менавіта тады ўзнікла вядомая ў XII стагоддзі Тураўская каталіцкая царкоўная катэдра, бо Тураў належаў Святаполку.

Адным словам, з кожным годам каталіцтва набліжалася да Полаччыны. Праўда, у XI стагоддзі стаўленне да гэтых з'яў з боку палачанаў было болей чым спакойнае. Вялікай розніцы паміж каталікамі і праваслаўнымі на той час не было. Тым больш гэта цяжка было заўважыць тым, хто і сам не так даўно прыняў хрышчэнне. Іншая справа, што нельга было не ўлічваць барацьбы каталіцтва і праваслаўя на Кіеўшчыне. І тут Усяслаў свайго не ўпускаў.

Пакуль Усевалад высвятляў дачыненні са сваім братам-здраднікам Ізяславам на Валыні, спрадвечную вотчыну Усевалада заняў князь Барыс Вячаславіч. Той самы Барыс, сын Вячаслава смаленскага, унук Яраслава Мудрага, які быў выгнаны са Смаленска братамі-трыумвірамі. Барыс заняў Чарнігаў. Але прасядзеў усяго восем дзён і збег у Тмутаракань да Рамана Святаславіча. Чаму Барыс адважыўся на гэтакі загадзя бесперспектыўны крок, на што разлічваў, хто за ім стаяў? Нарэшце, дзе быў Барыс цэлых 20 гадоў з таго часу, як застаўся без вотчыны,— з 1057 да 1077 года. Адказ на гэтыя пытанні мы знойдзем ніжэй, калі пабачым, як з дапамогай Усяслава Полацкага рыхтаваліся знакамітыя падзеі 1078-1079 гадоў. А васьмідзённае праўленне Барыса ў Чарнігаве не што іншае, як кароткатэрміновы яго прыпынак па дарозе з Полацка ў Тмутаракань. Усё мацней і мацней гучала колішняе рэха Тмутараканя.

А тут такі Усяславіч,
Ён прыкінуўся гнедым турам — залатыя рогі,
Пабег ён у царства Індзейскае,
Першы скок — на цэлую вярсту скочыў,
А другі скок — не змаглі знайсці.

Ён прыкінецца ясным сокалам,
Паляціць ён у царства Індзейскае.

У быліне «Волх Усяславіч» царства Індзейскае — аб'яднаны вобраз і Кіева, і Тмутараканя. А можа, у нейкай ступені і Чарнігаўшчыны. Нездарма барацьба за гэтае княства, да якога фармальна належаў і Тмутаракань, так абвастрылася на канцы XI стагоддзя. У 1077 годзе ў Тмутаракані на пасадзе сядзіць князь Раман Святаслaвіч, а на Валыні кіруе Алег Святаславіч. Але калі памірае іх бацька Святаслаў, вялікі князь кіеўскі, яго брат Усевалад разам з Ізяславам спрабуе без згоды малодшых князёў вырашыць іх лёс. Алегу было загадана адправіцца на княжанне ў Мурама-Разанскую зямлю. Гэта, безумоўна, выклікала рашучы пратэст з боку малодшых князёў. Што натуральна. З такім рашэннем не магла змірыцца і вельмі дзейная і вольналюбівая натура Алега. Следам за Вячаслaвічам смаленскім ён бяжыць з Чарнігава да свайго брата Рамана ў Тмутаракань.

У гэтым ланцугу падзей вельмі цікава супаставіць некаторыя дакладныя лічбы і даты. Недзе ў красавіку 1077 года Усевалад ідзе паходам супроць Ізяслава і польскага войска з Чарнігава праз Кіеў на Валынь, вотчыну Алега Святаславіча. 4 мая таго ж года на 8 дзён «збягае» да Чарнігава Барыс. Як апавядае летапіс, у гэты час у Чарнігаве ў «гасцях» Усевалада знаходзіцца Алег Святаславіч. Пасля таго як у Кіеве зноў усеўся Ізяслаў, Алег Святаславіч на канцы 1077 — пачатку 1078 года ўцякае ў Тмутаракань. Гэта азначае, што, папершае, «гасцяванне» Алега у Чарнігаве было сапраўднай высылкай, прымусовым утрыманнем князя на той час, як дзядзькі, памірыўшыся, дзялілі яго спрадвечныя землі. Па-другое, у адсутнасць Усевалада Алег і Барыс дамовіліся пра супольныя дзеянні супроць дзядзькоў маючы на ўвазе пазіцыю Полацка і Усяслава Чарадзея. І, па-трэцяе, Алег збег з Чарнігава, відаць пасля таго, як атрымаў з Тмутараканя вестку пра гатоўнасць брата Рамана ўступіць з ім, Барысам і Усяславам у хаўрус.

У Тмутаракані збіраецца магутная кааліцыя славянскіх князёў. І не дзіва, што адразу за паведамленнем пра ўцёкі Алега летапіс паведамляе пра забойства ў Заваloччы Глеба Святаславіча. Таго самага Глеба, якому даводзілася быць і князем тмутараканскім і наўгародскім, сустракацца з дружынамі Усяслава Чарадзея на Гзені. Заця́ты вораг Усяслава і саюзнік Уладзіміра Манамаха, Глеб мог далучыцца да сваіх братоў — Рамана і Алега — і тым самым узмацніць антыкіеўскую групоўку.

Вядома, цяжка паверыць, што Глеб мог згадзіцца на хаўрус з Усяславам Полацкім, хай і праз сваіх братоў. Але гэтак жа цяжка

паверыць у хаўрус Усяслава Чарадзея з Ізяславам кіеўскім, бадай самым галоўным ворагам Усяслава. Як бы там ні было, але Глеб Святаславіч быў забіты. Забіты пасля таго, як ягоныя браты стварылі моцную апазіцыю дзядзькам — Ізяславу і Усеваладу.

Пасля смерці Святаслава Яраславіча — вялікага князя кіеўскага — яго дзеці станавіліся перашкодай для Ізяслава і Усевалада. Глеб быў забіты тады, калі такія, як ён, пакінутыя без вотчыны князі аб'ядналіся дзеля абароны свайго гонару і суверэнных правоў. Менавіта пад кіраўніцтвам Глеба і маглі сысціся такія розныя людзі, як Усяслаў Чарадзей, Святаславічы і Барыс Вячаславіч смаленскі.

Магчыма, тут не абышлося без удзелу Уладзіміра Манамаха. Глеб, выгнаны з Ноўгарада, быў забіты 30 мая 1078 года, а ўжо зімою 1077-1078 года ягоны пасад заняў Святаполк Ізяславіч, з якім Манамах мінулай восенню хадзіў пад Полацк. Хадзіў ён паходам супроць Усяслава Брачыславіча і той зімою. Двойчы спаліў усё наваколле горада, але самога Полацка не ўзяў.

Чым былі выкліканыя гэтыя паходы? Як лічыць М. Ермаловіч,— выключнай нянавісцю Манамаха да Усяслава, імкненнем падпарадкаваць Полаччыну сваёй уладзе, забяспечыць спакой Смаленскай зямлі, якая належала Манамаху.

«Заваёўніцкія намеры Манамаха» хоць і мелі месца, у дадзеным выпадку, нам здаецца, не тлумачаць падзей 1077-1078 гадоў. Гэтак жа цяжка растлумачыць паходы Манамаха на Полацк у сувязі з нападам Усяслава ў 1077 годзе на Ноўгарад. Звестак аб гэтым у крыніцах няма. Але якраз у траўні з'яўляецца паведамленне пра Барыса Вячаславіча смаленскага, чый стольны град незаконна займаў Уладзімір Манамах. Ці не з'яўляюцца паходы Манамаха на Полацк спробай адпомсціць, пазбавіць Полацк «смаленскай карты» — князя Барыса? Пакуль Полацк падтрымліваў Барыса, існавала рэальная пагроза, што Барыс з дапамогай Усяслава верне сабе бацькаў пасад. Гэта, відаць, і змусіла Манамаха прадэманстраваць сваю сілу, а палачан — шукаць з дапамогай Барыса хаўрусу з Тмутараканем. Як бы там ні было, але такі саюз аформіўся. Ён выступіў супроць залішне цэнтралізатарскіх памкненняў Кіева.

У верасні 1078 года Алег і Барыс з дапамогай Рамана тмутараканскага рушылі паходам на Чарнігаў. Дзеля гэтага яны нанялі вялікае войска, сярод якога былі і полаўцы. 25 верасня аб'яднанае войска паўднёварускіх князёў на рацэ Сожыцы начыста разбівае Усевалада кіеўскага і чарнігаўскага. Шмат хто загінуў у гэтай бітве, у тым ліку і вядомыя ўжо нам па падзеях 1068 года ў Кіеве баярын

Тукы — брат Чудзіна, які яшчэ тады раіў забіць у порубе Усяслава Полацкага, ваявода Парэй і іншыя.

Атрымаўшы перамогу, Барыс і Алег сталі княжыць у Чарнігаве, а Усевалад збег у Кіеў да свайго брата Ізяслава. Усё было б зразумела ў гэтых падзеях, каб не адна акалічнасць: чаму Уладзімір Манамах не выступіў у абарону свайго бацькі і Чарнігава, у той час як меў вялікае і добрае войска? Як сведчыць «Павучанне» самога Манамаха, на Вялікдзень, 8 красавіка 1078 года, ён быў у Чарнігаве і рабіў бяседу на Чырвоным двары ў гонар Алега Святаславіча. Пасля гэтага вярнуўся ў свой Смаленск, дзе і сядзеў да канца жніўня — пачатку верасня.

Калі пад Чарнігаў падышлі войскі Алега і Барысу, ён нават не зварухнуўся, каб дапамагчы свайму бацьку. А яму ж было значна бліжэй, чым іншым. І толькі пасля таго, як Усевалад быў разбіты і выгнаны з Чарнігава, Манамах, прабіваючыся «укрузь» палавецкіх войскаў — хаўруснікаў тмутараканскіх князёў, злучаецца з разбітым бацькавым войскам ў Пераяславе. Адсюль яны разам ідуць па дапамогу ў Кіеў. Тлумачэнне гэтаму можа быць толькі адно: пры ўсім жаданні Манамах нічым не мог памагчы свайму бацьку. І адзінай сілай, якая на той час яго стрымлівала, мог быць толькі Усяслаў Полацкі са сваім войскам. Адначасовы ўдар па Чарнігаве з поўдня і поўначы з'явіўся б канцом для ўсіх Усеваладавічаў, у выніку якога яны ўжо ніколі б не падняліся. Таму Манамах вымушаны быў сядзець у Смаленску і стрымліваць пагрозу з боку Усяслава Чарадзея. Праўда, сцвярджаць, што за гэты час паміж Усяславам і Манамахам не адбывалася ніякіх сутычак, нельга. Але вядомыя нам летапісы пра гэта маўчаць.

Так ці іначай, але Усевалад з сынам захаваў частку войска і застаўся жывы. Кааліцыя настроеных супроць Кіева князёў атрымала першую перамогу. Паводле «Аповесці мінулых часоў», у Кіеве адбылася «расчуленая» сцэна прымірэння двух братоў — Ізяслава і Усевалада, са скаргамі на цяжкі і неміласэрны лёс. Абодвух ахінула глыбокая туга. Адзін — Ізяслаў, вяртаючыся з няўдалай замежнай «вандроўкі», страціў найбагацейшы князеўскі скарб, які застаўся ў «ляхаў», і стаў «жабраком». Другі — Усевалад — марыў аднавіць імперыю прашчура Уладзіміра, а застаўся нават без спрадвечнага родавага гнязда. На глебе агульнай няўцешнасці і пакут яны сабралі свае апошнія сілы супроць «малодшых князёў» і выйшлі на пабаявішча.

Вестка аб жорсткай бітве на Няжацінай ніве 3 кастрычніка 1078 года і паражэнне Барыса і Алега заспела Усяслава ў Смаленску. У гэтай бітве каля паселішча Гурычава загінуў Ізяслаў Яраславіч і князь

Барыс. Аб тым Барысе «Слова пра паход Ігараў» кажа: «Барыса ж ВячаславІча на суд прывяла слава і на Кані зялёны мурог паслала для вечнага начлегу...»

Не паспелі яшчэ пахаваць забітых вояў, як Уладзімір Манамах з адборным чарнігаўскім палком «а двух конях» (на перакладных) імчыць наўздагон Усяславу Полацкаму. Ды таго і следу не стала разам з цяжкім абозам смаленскай здабычы. Манамах не адважыўся ісці на Полацк. Але і даравадь Усяславу хаўрус з тмутараканскімі князямі, разгром сваёй вотчыны не мог. Таму ў бяссільнай злосці «ўслед за Усяславам спаліў я зямлю (Полацкую), спустошыўшы <яе> да Лукомля і Лагожска, ды супроць Друцка ваюючы».

Падзеі 1077-1078 гадоў Манамах не мог дараваць Усяславу і праз 6 гадоў. Увосень 1084 года Манамах з чарнігаўцамі і полаўцамі-чыцеевічамі знянацку нападае на Менск. Захапіўшы горад, не пакінулі ў ім «ні чалядзіна ні скаціны». Відаць, як слушна заўважае М. Ермаловіч, гэта была на той час прымаўка, якая азначала поўнае абрабаванне і знішчэнне дарэшты. Двойчы разбураны на працягу 17 гадоў (1067 і 1084 гады) Менск на рацэ Менцы адрадзіцца ўжо не змог. І таму цалкам слушнае меркаванне, што назва горада была перанесеная ў канцы XI — пачатку XII стагоддзя на ўмацаваны цэнтр-дзядзінец у сутоцы Нямігі і Свіслачы[1].

Манамах як рабаўнік напаў на Менск нечакана і гэтак жа нечакана знік за межы Полаччыны. У яго не было ні адвагі, ні сілы адкрыта выступіць супроць Усяслава, які моцна і ўпэўнена трымаўся на пасадзе свайго княства ў пару сталасці і дзяржаўнай мудрасці. Яму ў гэты час было каля 52 год.

Пра далейшыя ўзаемадачыненні Чарадзея і паўднёварускіх князёў летапісы маўчаць. Але можна пэўна сцвярджаць, што барацьба Усяслава за незалежнасць і самастойнасць княстваў не была марная. Ён выканаў сваю галоўную задачу: Полацкая дзяржава жыла і квітнела.

[1] Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. М н., 1987. С. 63—64.

## ЛЮДЗЯМ СУДЫ ЧЫНІЎ, КНЯЗЯМ ГАРАДЫ РАЗДАВАЎ

*Спакой * Разлятаюцца сокалы з бацькоўскага гнязда * На сыходзе паганскіх часоў * Любеч без палачанаў * У спадчыну — Славу, Зямлю і Волю*

На прасторах Усходняй Еўропы віравала буйнае палітычнае жыццё. Пасля смерці Ізяслава Яраславіча на Няжацінай ніве адзінаўладным гаспадаром Кіева стаў Усевалад і яго сын Уладзімір Манамах. Манамаху па-ранейшаму не давала спакою слава Уладзіміра-Хрысціцеля і фанатычна-неадчэпная ідэя стварэння новай імперыі. Ажно да самай смерці ў 1125 годзе ледзь не кожнае «лета» хадзіў Манамах паходамі на суседнія княствы. Дабіраўся ён і да Полацкай зямлі. Але пакуль быў жывы Усяслаў Чарадзей, ніхто не адважваўся перасекчы мяжу Полацкага княства. З 1084 да 1105 года летапісы маўчаць аб войнах супроць нашай зямлі. А гэта ж 21 год! Аўтарытэт Чарадзея быў настолькі моцны, што нават пасля яго смерці нейкі час на Полаччыне было спакойна.

Усё гэта спрыяла ўмацаванню Полацкай зямлі, якая развівалася ў рэчышчы ўласных традыцый. Старадаўні князеўскі радавод, тэрытарыяльная і этнічная еднасць розных народаў, агульнадзяржаўная гаспадарка і палітычная сістэма — вось той падмурак, на якім мацавалася Полацкае княства. У XIII стагоддзі на тэрыторыі Полацкай дзяржавы пачала існаваць свая, так званая полацка-віцебская, грашова-вагавая сістэма — аснова любой самастойнай эканомікі.

Бруіўся навакольны свет у варунках палітычных амбіцый і ўзаеманепаразуменняў. Біліся, інтрыгавалі між сабою Ізяславічы і Усеваладавічы. Падасланым забойцам быў заколаты Яраполк Ізяславіч. Не дапамаглі яму ні «ляхі», ні папская грамата-була. Алег Святаславіч пасля паражэння на Няжацінай ніве збег у Тмутаракань, а адтуль — «у грэкі». Чатыры гады ён пражыў у Візантыі, два з якіх — на востраве Радос, дзе ажаніўся са знатнай грачанкай Феафані Музалон. Пасля вярнуўся ў Тмутаракань, дзе і княжыў дзесяць год.

Тым часам у Полацку гадаваліся нашчадкі Усяслава. Розныя даследчыкі налічваюць 6, а то і 7 сыноў Усяслава: Давыд, Глеб, Раман, Расціслаў, Святаслаў-Георгій, Рагвалод-Барыс. Апошняга, князя Рагвалода-Барыса, некаторыя лічаць за дваіх — Рагвалода і Барыса[1].

---

[1] Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896. С. 70—71.

Дакладны час нараджэння князевічаў невядомы. Акрамя, бадай, Расціслава. Пад 1070 годам у Іпатаўскім летапісе па Хлебнікаўскім і Пагодзінскім спісах адзначана: «Нарадзіўся ва Усяслава сын, і назвалі яго імем Расціслаў». Але па другіх спісах гэтага летапісу сын нарадзіўся не ва Усяслава, а ва Усевалада. Усе ж астатнія князевічы з'яўляюцца на старонках старажытных пісьмовых крыніц толькі пасля смерці бацькі — Чарадзея. Гэта і не дзіўна, бо побач з ім, такой незвычайнай гістарычнай постаццю, сыны, безумоўна, былі ў ценю. Няма сумневу, што ўсе яны з маленства выхоўваліся гэтак жа, як калісьці сам Усяслаў. З малаком маці яны ўвабралі ваярскую і валадарскую навуку. І не толькі яе.

Ведаючы сёння гісторыю Полаччыны як да XI стагоддзя, так і пасля, можна сцвярджаць, што Усяслаў Чарадзей змог перадаць сынам самае галоўнае — адданасць сваёй бацькаўшчыне. Як празорлівы палітык, Усяслаў разумеў, што развал імперыі Рурыкавічаў — гэта толькі пачатак больш глыбокага і непазбежнага дзялення асобных княстваў. Гэтаму спрыялі не амбіцыі маладых князёў, а заканамернае ўмацаванне асобных земляў, перадусім праз эканоміку і гандаль. Можна толькі здзіўляцца мудрасці Усяслава, які пайшоў на падзел сваёй дзяржавы менавіта дзеля таго, каб захаваць яе адзінства. Парадокс? Не, дыялектыка. Чарадзей, вядома, не ведаў такіх законаў, але, так бы мовіць, адчуваў іх нутром.

З прычыны адсутнасці полацкіх летапісаў мы не можам дакладна сказаць пра ўдзел Полацкай дзяржавы ва ўсіх гэтых падзеях. Вядома толькі, што Полацк перайшоў да старэйшага сына Усяслава — Барыса, а Менск — да Глеба. Нехта сеў у Віцьбеску, нехта — у Друцеску, нехта — у Лагошаску. А камусьці дастаўся Брачыслаўль (сучасны Браслаў). Чарадзей Полацкі не проста аддаў сынам гэтыя землі. Прадчуваючы недалёкую смерць, князь даў магчымасць сынам увайсці ва ўладанне княствамі, з яднацца на ідэі незалежнасці і непадзельнасці усей вялікай Полацкай дзяржавы, навучыў іх жыць у міры і згодзе не толькі між сабою, але і з суседзямі. Як найвялікшы і неаспрэчны аўтарытэт, ён мог ухіліць паміж сынамі ўсе непаразуменні.

Безумоўна, хаўрус полацкіх князёў не быў ідэальны, як не бывае ідэальнай дзяржавы ў форме федэрацыі (а менавіта такой была Полаччына ў XII-XIII стагоддзях). Але адчуванне сваёй этнічнай, культурнай, эканамічнай і палітычнай еднасці на той час у полацкіх князёў было самым моцным. Нездарма ў 1127 годзе ў паход супроць ганарыстых полацкіх Усяславічаў паднялася ўся паўднёва-ўсходняя Русь. Супрацьстаяць вялізнаму "войску было немагчыма. Полацкія

князі былі схоплены і высланы ў Візантыю. З таго выгнання жывымі вярнуліся толькі двое: Васіль ды Іван. Беспрэцэдэнтны ў гісторыі Еўропы вайсковы паход супроць цэлага княжеўскага роду сведчыў пра магутнасць і згуртаванасць гэтага роду, а таксама той вялікай дзяржавы, якою ён валодаў. І хоць Полаччына была падзеленая на асобныя княствы, яна была адзіным незалежным гаспадарствам.

Тым часам адыходзілі ў нябыт паганскія часы. Памятаеце, у «Слове пра паход Ігараў»: «На сёмым веку Траяна кінуў Усяслаў жэрабя...» Акадэмік Ь. Рыбакоў пераканаўча даказаў, што «Траянавыя вякі» звязаныя з цараваннем рымскага імператара Траяна[1]. Гэта былі часы бурнага росквіту славянства. Для Рымскай імперыі яны скончыліся нашэсцем гунаў і готаў, а для славян — пачаткам каланізацыі леса-стэпавай зоны Усходняй Еўропы. З тых вякоў да часоў Усяслава Чарадзея мінула якраз сем стагоддзяў. На працягу гэтых стагоддзяў славяне захоўвалі сваю старадаўнюю паганскую культуру, шанавалі сваіх багоў. І толькі з прыняццем хрысціянства ўсё сышло ў нябыт. Але ці ўсё?

Нездарма канец Траянавых часоў аўтар «Слова...» звязвае з Усяславам Полацкім. Чарадзей, а разам з ім і ўся Полаччына былі апошнім трывалым апірышчам у славянскім свеце. Таму можна ўявіць, які жах у праваслаўных кіеўскіх хрысціян выклікалі дзіўныя падзеі 1092 года: «У Полацку стала зусім блага. Уначы на гарадскіх вулках чуліся нібы стогны людскія, тупат, іржанне конскае. Гэта гойсала па горадзе д'ябальская сіла. Хаця ніхто з палачанаў увачавідкі не бачыў, што рабілася, але кожны, хто дзеля цікаўнасці выходзіў з харомiны сваёй ці толькі прачыняў вакно,— неўзабаве паміраў, нябачна працяты д'яблам. Калі ж Палачаны перасталі ўначы выходзіць з хорамаў сваіх, д'ябальская сіла пачала дзеяць удзень. Сярод стогну, плачу, тупату паміралі людзі Полацка і воласці. Быццам цэлае войска д'яблаў скакала па зямлі на конях сваіх, нябачнае для людскіх вачэй, пакідаючы па сабе толькі «тупаніны» ці сляды конскіх капытоў. Вось тады і сталі гаварыць у народзе: «Як мерцвякі-наўе б'юць палачанаў». А з'ява гэтая пачалася ад Друцка».

У Радзівілаўскім летапісе ёсць мініяцюра з выявай гэтага полацкага «цуду». Хоць летапіс сведчыць, што наўе нельга ўбачыць, мастак намаляваў жахлівых пачвараў, якія ходзяць па горадзе[2].

---

[1] Пад «Травымі вякамі”, разумеюць не сам час каравання Марка Ульпія Траяна (98-117 гады нашае эры), а звязаны з ім пачатак апошняга ўздыму і развіцця Рымскай імперыі, які прыпаў на II-IV стагоддзі.

[2] Наўе — мерцвякі, ці, дакладней, душы памерлых. Але гэта не душы сваякоў, якім быў прысвечаны культ «дзядоў». Наўе — гэта душы ворагаў, якія былі за нешта пакараныя (тапельцаў, з'едзеных ваўкамі, забітых і г. д.). У балгарскім фальклоры наўе падобныя да птушак, яны — вампіры, надзвычай небяспечныя для людзей (Рыбакоў Б. А. Язычество Древней Руси. М., 1987. С. 462—463).

Адкуль з явіліся мерцвякі-наўе ў Полацку, чаму менавіта тут? Канец XI стагоддзя адзначаны надзвычай цяжкімі кліматычнымі ўмовамі для ўсёй Усходняй Еўропы. Возьмем толькі пачатак 90-х гадоў 1090 год — сухмень, 1091 год — землятрус, эпідэміі, мор скаціны, 1092 год — халады на пачатку лета, сухмень, эпідэміі і мор скаціны, голад, 1093 — зноў голад. Галоднымі гадамі былі 1095-1096. Пяць галодных гадоў запар з адзінаццаці былі цяжкім ліхам для людзей. Вядома іх немагчыма было нават і блізка параўнаць, напрыклад, з галоднымі адзінаццаці-пятнаццацігоддзямі ў XIII стагоддзі, але ўсё роўна гэта была страшная навала. Ва ўяўленні чалавека тых часоў, пошасць, голад — божая кара. А самым сташным богазневажэннем была і ёсць нявера ў Бога. Гэтаю самаю нявераю ў XI стагоддзі славілася Полацкая зямля. А таму, на думку летапісцаў, павінная ва ўсіх навалах. Яе першую і пакараў Бог, наслаўшы мерцвякоў. З богазневажаннем, з паганствам непарыўна было спалучанае імя полацкага князя. Нездарма ў Цвярскім летапісе ўсе гэтыя падзеі змешчаны пад назовам «Об устрашениях и мечтах бесовских в Полотску при князе Всеславе».

Пошасць, што прайшлася па Полаччыне безумоўна, прынесла вялікую шкоду. Шмат каму гэта давала падставу прыгадаць бязбожнікаў-палачанаў з іх князем народжаным ад чарадзейства. Дзякуючы мудрай і празорлівай палітыцы Усяслава ягоная дзяржава стала недасягальнай для валадароў зямных. Але тое, што не маглі зрабіць яны, было па сілах валадару нябеснаму — Богу. Ці не з гэтым звязана апошняя “прыпеўка”, якую праспяваў Усяславу славуты Баян.

Ні хітраму,
ні спрытнаму,
ні чарадзею дасціпнаму
суда божага не мінуць.

Адзіны суд, якому быў падуладны Усяслаў Чарадзей,— суд Божы. Перад ім шматпакутны і ўдачлівы полацкі князь неўзабаве і паўстаў. Першая нататка, з якой пачынаюцца летапісныя артыкулы 1101 года, такая: «Спачыў на векі Усяслаў, князь полацкі, месяца красавіка, у чатырнаццаты дзень, у дзевяць гадзін дня, у сераду». Незвычайная для летапісаў дакладнасць, але ж і незвычайная для гісторыі постаць — Усяслаў Брачыславіч Чарадзей, вялікі князь полацкі.

За чатыры гады да смерці Усяслава ў горадзе Любечы сабраліся ўсходнеславянскія князі, каб абвясціць даўно наспелы і абмыты

---

Паводле В. Ластоўскага, наўцом называюць нядаўна памерлага нябожчыка, а таксама нябожчыка, які ходзіць у сваім целе і ссе кроў. Навец процістаўляецца мярсьню — даўно памерламу, які «рассыпаўся» і не мае ўжо цела (Ластоўскі В. Падручны расейска-крыўскі слоўнік. Коўна, 1924. С. 314).

крывёю прынцып: «Адгэтуль маем у адзіным сэрцы і захоўваем Рускія землі; кожны ды трымае вотчыну сваю». На гэтым з'ездзе не было ні Чарадзея, ні яго сыноў. Чаму? Ды проста таму, што гэты самы прынцып — «кожны ды трымае вотчыну сваю» — ён абвясціў яшчэ ў 1065 годзе, і да 1097 года для Усяслава, як і для ўсёй Полаччыны, ён даўно быў здзейснены. Яму не было чаго дзяліць з астатнімі князямі. А мяркуючы па тым, што на з'ездзе дзялілі «Рускую зямлю», Чарадзей гэткай сваю Полаччыну не лічыў.

Тое, што даўно здзейснілася на Полаччыне як значны прагрэсіўны крок наперад, цяжка, з крывёю ўжывалася ў нетрах астатніх усходнеславянскіх, «рускіх» земляў. Не паспелі князі ў Любечы зрабіць дамову, як зноў павыцягвалі з похваў свае мячы і пачалі зацята біцца на злом галавы. Урэшце, давялося збіраць другі з'езд у 1100 годзе у г. Увецічах (Віцічаве), а пасля і яшчэ адзін — у 1103 годзе каля Долабскага возера. Але і яны не спынілі міжусобіцы князёў. Як пры жыцці Усяслава, так і пасля яго смерці палачане не прысутнічалі ні на адным з ездзе. Сапраўды, хто ж гэта паедзе да чужакоў, каб дзяліць бацькаву зямлю? Хіба што ў госці. Але, відаць, і госці тыя былі не даспадобы полацкім князям — ні старым, ні маладым. Бо яны мелі тое, што было адваяванае імі ў крывавых лютых сутычках з ворагам і па чалавечых і Божых законах належала толькі ім: Славу, Зямлю, Волю і ўсё тое, што месціцца ў вялікім і ёмістым слове — БАЦЬКАЎШЧЫНА.

## ШТО НАМ У ІМІ СЁННЯ ТВАІМ ?

*Заснавальнік беларускай дзяржаўнасці * Камяні ў падмурак магутнай культуры Ад удзячных і няўдзячных нашчадкаў * Невычарпальная крыніца мастацтва * Ці будзе помнік на вуліцы Усяслава?*

Вучоныя любяць спрачацца. Без гэтага не бывае навукі. Пісьменнікі любяць прыдумляць. Без гэтага не бывае мастацтва. Чалавеку ўласцівы спрадвечны пошук. Пошук думкі, слова, ісціны, нязведаных таямніц. Народу заўсёды трэба ведаць свае вытокі. Сёння беларусы — адзін з трох усходнеславянскіх народаў, які мае сваю афіцыйную дзяржаўнасць, сваю спрадвечную зямлю. Мы жывем на гэтай зямлі, захоўваем яе абрады і звычаі, гаворым на яе мове. Ніхто не будзе аспрэчваць, што ў беларусаў ёсць свая гісторыя. Але адкуль яна бярэ свой пачатак, адкуль бярэ пачатак наша дзяржава?

З часоў сталінскага рэжыму «ўзрост» беларускай дзяржавы пачыналі адлічваць ад 1919 года — ад абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У 20-х гадах, у часе нацыянальна-культурнага адраджэння, пачатак дзяржаўнасці лічылі ад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Але глыбей вытокі беларускага гаспадарства і беларускага народа амаль ніхто не шукаў. Быццам на Беларусі і не было ніколі дзяржавы Рагвалода, Ізяслава Брачыславіча, нарэшце, Усяслава Чарадзея. Цэлы пласт нашай гісторыі выпадаў не толькі з падручнікаў па гісторыі Беларусі, але і з сур'ёзных навуковых даследаванняў перыяду Расійскай імперыі і савецкага часу. Гэта адбывалася таму, што ад М. Ламаносава і В. Тацішчава, праз В. Ключэўскага і С. Салаўёва да М. Ціхамірава і Б. Рыбакова гісторыя беларускіх земляў разглядалася цераз прызму Старажытнарускай дзяржавы. А як вядома з фізікі, любая прызма скажае прамень святла. Гэтае скажэнне было выгаднае вяліка-дзяржаўным дзеячам ад палітыкі, такім, як М. Мураўёў-Вешальнік, В. Кнорын, А. Мяснікян,— усім тым, хто адмаўляў беларусам не толькі ў іх адметнай культуры і мове («испорченный русский язык»), але і ў роднай зямлі («Северо-Западный край»).

Але беларуская зямля жыла насуперак усяму: паланізацыі, русіфікацыі, высылцы людзей у Сібір, забойствам у Курапатах. Народ жыве і захоўвае памяць пра сваю мінуўшчыну. У ім жыве памкенне і да сваёй сапраўднай незалежнай дзяржаўнасці, падмурак якой быў закладзены яшчэ Усяславам Чарадзеем.

Ці было Полацкае княства беларускай дзяржавай? Сапраўды, назоў «Белая Русь» упершыню прыгадваецца ў заходнееўрапейскіх хроніках толькі ў XIII стагоддзі. Геаграфічна некаторы час ён нават належаў да Масковіі і толькі пасля перайшоў да нашай зямлі. У XV-XVII стагоддзях Беларусь называлі Літвой, а беларусаў — ліцвінамі. Дый пазней... напрыклад, Адам Міцкевіч, прыгадваючы сваю радзіму — Наваградак, так пачынае знакамітую паэму «Пан Тадэвуш»: «О Літва, мая айчына!» Але як бы ні мяняліся назовы Беларусі на працягу розных часоў, людзі жылі на ёй спрадвеку. Таму гісторыю нашае зямлі нельга пачынаць толькі з таго моманту, калі яна стала называцца Беларуссю. Гэтак сама, як гісторыю Украіны — ад XVII стагоддзя, калі ўвайшла яна ў склад Масковіі і стала «Украіннай зямлёй».

Кажуць, дзеля таго, што ў XI стагоддзі беларуская народнасць яшчэ не сфармавалася, Полацкае княства лепш называць не беларускай дзяржавай, а дзяржавай на тэрыторыі Беларусі. Але ад гэтай моўнай эквілібрыстыкі сутнасць гістарычнай з'явы не мяняецца. Полацкае княства — магутнае і незалежнае гаспадарства, створанае воляй народа і розумам князёў,— было першае на Беларусі. Бадай, галоўная заслуга Усяслава Чарадзея ў тым, што ён правільна зразумеў і ацаніў аб'ектыўныя ўмовы развіцця беларускіх земляў ужо ў XI стагоддзі. Яго дзейнасць была скіраваная найперш не на раз'яднанне з Кіевам ці Ноўгарадам, а на кансалідацыю земляў і народаў у межах тагачаснай Беларусі.

Палітыка Усяслава Чарадзея мела вялікі плён. Дробныя княствы, рознаэтнічныя плямёны, якія не мелі буйных гарадоў, развітой палітычнай сістэмы, высокаэфектыўнага рамяства, а значыць, і гандлю, імкнуліся да хаўрусу з магутным суседам — Полацкам. У падмурак дзяржавы, акрамя палітыкі, закладвалася і культура.

Так, мы не памылімся, калі скажам, што падмурак найбагацейшай культуры быў закладзены ў часы Чарадзея. Безумоўна, і да Усяслава на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых землях, існавала цікавая, адметная культурная спадчына. Шкада, што ад яе амаль нічога не захавалася. У значнай ступені таму, што да прыняцця хрысціянства не існавала трывалай традыцыі пісьменства. Летапісныя запісы аб звычаях і жыцці народаў VIII-IX стагоддзяў урыўкавыя і кароткія. Духоўная культура паганства пачынаючы з X стагоддзя паступова сыходзіла ў нябыт, хаця культурная палітыка полацкага князя, як мы адзначалі, была накіраваная на мірнае суіснаванне старога і новага. Вось чаму мы не знаходзім у летапісах звестак пра гвалтоўнае хрышчэнне Полаччыны, а Усяслаў Полацкі ў летапісах,

«Слове пра паход Ігараў» і ў быліне «Волх Усяславіч» выглядае такім супярэчлівым.

Будаўніцтвам полацкай Сафіі Усяславам была распачатая традыцыя мураванага дойлідства ў старадаўняй дзяржаве. Гэты сабор для дойлідаў наступных стагоддзяў стаў узорам не столькі формы, як зместу. На яго прыкладзе лёгка прасачыць, як можна пераасэнсаваць і пераўвасобіць традыцыйныя догмы, каноны архітэктуры.

Традыцыі самастойнага мыслення дойлідаў, рамеснікаў-творцаў, якія праявіліся ў часы Усяслава, выбухам уварваліся на Полаччыну ў XII стагоддзі. Гэта было падобна да распускання кветкі з пупышкі, калі бутон паступова цягнецца да сонца і раптам распускаецца, выпусціўшы на волю прыгожыя рознакаляровыя пялёсткі. Так і ў архітэктуры, мастацтве, філасофіі, літаратуры і, безумоўна, у музыцы, якая, на жаль, да нас не дайшла.

Калі ўзводзяцца адзін за адным храмы, квітнеюць манастыры, дзейнічаюць школы для моладзі, растуць гарады,— значыць, усё гэта забяспечана дзяржавай як палітычна, так і эканамічна. Стварыўшы дзяржаву, Усяслаў Брачыславіч заклаў падмурак, на якім толькі і мог будавацца далейшы лёс нашае зямлі і яе жыхароў. Падмурак палітычна-эканамічны стаў падмуркам духоўным — мэтаю кансалідацыі любога народа.

Народ жыў, жыве і будзе жыць. Але калі мы народ, то што захавалі з тае спадчыны, якую пакінуў нам Усяслаў? На жаль, болей страцілі. Згубілі даўнія традыцыі, забыліся на свае звычаі, абрады і нават на самае святое, што ёсць у кожнага народа,— матчыну мову. Можа, не ва ўсім мы самі і вінаватыя. Нашу нацыянальную годнасць ціснулі цяжкімі каткамі русіфікатарства і паланізацыі. Сціплага, памяркоўнага, цягавітага беларуса доўгі час прывучалі да думкі, што ён, уласна кажучы, не існуе. Дый адкуль яму было ўзяцца, калі напачатку была Старажытнаруская Кіеўская дзяржава, пасля Літва, або Літоўскае княства, потым — Паўночна-заходні край, правінцыя вялікай імперыі. У што яму было верыць, на што спадзявацца, калі «дзеячы» рэвалюцыі спрачаліся вакол пытання: «А ці ёсць такі народ — беларусы, ці толькі рускія з «тутэйшай гаворкай». На каго людзям трэба было азірацца, на якіх нацыянальных герояў? Князі ранняй феадальнай пары — «рускія князі», часоў Вялікага княства — «літоўскія». Царкву нашу, узніклую самастойна і незалежна, цягнулі то на ўсход, то на захад, пакуль не ўтварылася Унія. Але, калі ўніяцтва стала, па сутнасці, нацыянальнай рэлігіяй, яго гвалтоўна адмянілі, і ўсіх далучылі да праваслаўя. Права на існаванне мае кожная канфесія,

але чаму ад гэтага мусіць пакутаваць народ? Нарэшце, адабралі і гэтую апошнюю веру, а наўзамен падаравалі чарадзейныя казкі пра светлую будучыню. Адпаведна гэтым казкам узводзіліся і новыя куміры. Зараз у Полацку тры помнікі У. І. Леніну. Было б чатыры, каб не падарваны помнік у 1941 годзе. А вось бажніц да 1917 года было каля 18. Зараз — шэсць. З іх да нядаўняга часу толькі адна была дзейная.

Прайдзіце па горадзе — і вы знойдзеце помнік камсамолу, два помнікі гвардзейцам, якія вызвалялі горад, мемарыяльныя дошкі ў гонар рэвалюцыйных падзей. Вы знойдзеце і помнік Францішку Скарыну. Але гэта хутчэй выключэнне з правіл, якое зроблена на радзіме вялікага гуманіста, шырока вядомага ва ўсім свеце. Ёсць вуліца Камуністычная і Савецкая (як жа без іх!), Гогаля і Талстога, Юбілейная і Касманаўтаў, вуліца і плошча Леніна. Адышлі ў нябыт вуліцы Ніжне- і Верхнепакроўская, Невельская, Рыжская, Азараўская, Спаская... Затое замест знесеных Верхнепакроўскай і Аляксандраўскай зрабілі праспект К. Маркса. Пра што казаць, калі нават знакаміты Сафійскі сабор знаходзіцца на Бальнічным завулку! «Людзі добрыя, дзеці зямлі-маткі маёй!», ці ж не ў Полацку жылі Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў, Брачыслаў, Усяслаў, князь Барыс, Уладзімір, Еўфрасіння, Іаан, Богша, Міна, Нічыпар, Андрэй Полацкі, Сымон Полацкі і іншыя... Дзе ж памяць пра іх, у якіх звілінах мозгу схавана?

Так, мы пачынаем прачынацца. Л. Дайнека напісаў раман пра Усяслава Полацкага «След ваўкалака». Мастакі А. Марачкін, Я. Кулік прысвяцілі яму свае творы. З нябыту ўздымаюцца гістарычныя палотны Я. Драздовіча, кніга А. Сахарава «Полацкі князь Усяслаў — беларускі нацыянальны асілак», кніга Д. Леанардава «Полацкі князь Усяслаў і яго час», нарысы гісторыкаў У. Ігнатоўскага, В. Ластоўскага... Але ўсё гэта — кропля ў акіяне забыцця.

Наша гісторыя — невычэрпная крыніца натхнення і духоўнасці. Постаць Усяслава Брачыславіча ў ёй — адна з самых яскравых бліскавіц, першапачатак спазнання ўласнага «я». Яна прывабная, яна таямнічая і ўдзячная. Дык ці будзе стаяць помнік на вуліцы імя Усяслава Чарадзея?

Гэта залежыць толькі ад нас.

**© OCR: Камунікат.org, 2014**
**© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2014**
**© PDF: Камунікат.org, 2014**

**ЗМЕСТ**


ДА ЧЫТАЧА

НАРОДЖАНЫ АД ЧАРАДЗЕЙСТВА
На неўзаранай зямлі збожжа не буяе ■ Рагвалодавы карані ■ Бацькоўскія крылы ■ Дзе родны край і дзе чужынскі? ■ Пад сонцам ласкавым на неспакойнай зямлі ■ Жыццё пачынаецца з першага кроку

МАЦУЮЧЫ СПАДЧЫНУ СВАЮ
На полацкім пасадзе ■ Першыя дзесяцігоддзі ■ Чацвёртая ў свеце ■ Магутны горад на Дзвіне ■ На мяжы чужынскіх земляў ■ Валадарская навука

МЕЧ РАГВАЛОДА
Збіранне войска ■ Хольмградскія званы ■ Нямігі крывавыя берагі ■ Праклён парушальнікам клятвы ■ З кіеўскіх вязняў — у кіеўскія князі ■ Загадка Тмутараканя ■ Куды паклікалі званы?

РАДЗІМА У КОЖНАГА СВАЯ
Вяртанне і выгнанне ■ Помста за знявагу ■ «Адпусцілі дзеля Бога» ■ Пагоня за паваднымі коньмі ■ Рэха Тмутараканя ■ Меч хаваецца ў похву

ЛЮДЗЯМ СУДЫ ЧЫНІЎ, КНЯЗЯМ ГАРАДЫ РАЗДАВАЎ
Спакой ■ Разлятаюцца сокалы з бацькоўскага гнязда ■ На сыходзе паганскіх часоў ■ Любеч без палачанаў ■ У спадчыну — Славу, Зямлю, Волю

ШТО НАМ У ІМІ СЁННЯ ТВАІМ?
Заснавальнік беларускай дзяржаўнасці ■ Камяні ў падмурак магутнай культуры ■ Ад удзячных і няўдзячных нашчадкаў ■ Невычарпальная крыніца мастацтва ■ Ці будзе помнік на вуліцы Усяслава?

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ Серыя акадэмічная
Научно-популярное издание
ТАРАСОВ СЕРГЕЙ ВАСИЛЬЕВИЧ
ВОЛШЕБНИК СЕДЬМОГО ВЕКА ТРОЯНА
Всеслав Полоцкий
Минск, издательство «Навука і тэхніка» На белорусском языке
Навукова-папулярнае выданне
ТАРАСАЎ СЯРГЕЙ ВАСІЛЕВІЧ
ЧАРАДЗЕЙ СЁМАГА ВЕКУ ТРАЯНА Усяслаў Полацкі

Рэдактар З. Ф. Санько Мастак Т. П. Кулажанка Мастацкі рэдактар В. Л. Жахавец Тэхнічны рэдактар С. А. Курган Карэктар Т. Ф. Піліповіч

Дарагія сябры!

У 1988 годзе выдавецтва «Навука і тэхніка» распачало выпуск серыі «Нашы славутыя землякі». У ёй выдаюцца кнігі пра найменш вядомых сучаснаму чытачу нашых суайчыннікаў — выдатных дзеячаў навукі, культуры, мастацтва, літаратуры, вынаходнікаў, грамадскіх дзеячаў. Ды не толькі пра тых, хто жыў і працаваў на радзіме, але і пра беларусаў, воляю лёсу закінутых на чужыну, якія зрабілі важкі ўклад у развіццё навукі і культуры, іншых народаў.

Серыя разлічана на шырокае кола чытачоў — усіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай культуры, навукі, грамадскіх рухаў, лёсам найбольш таленавітых нашых землякоў. Яна можа быць скарыстаная настаўнікамі ў пазакласнай рабоце, выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, сябрамі грамадскіх суполак, якія выступаюць за адраджэнне мовы, гістарычнай спадчыны і нацыянальнай свядомасці беларусаў.

У 1988-1991 гадах у гэтай серыі выйшлі кнігі:

Грыбкоўскі В. П., Гапоненка В. А., Кісялёў У. М. Прафесар электраграфіі і магнетызму

Пра Якуба Наркевіча-Ёдку (1847-1905), таленавітага вучонага-прыродазнаўца

Мархель У. І. Вяшчун славы і волі

Пра Уладзіслава Сыракомлю (1823-1862), выдатнага паэта-дэмакрата

Галакціёнаў С. Г., Яцкевіч Г. М. Рыцар навукі з Нянькава
Пра Уладзіслава Львоўскага (1838-1910), таленавітага даследчыка прыроды і фалькларыста

Арлоў У. А. Асветніца з роду Усяслава
Пра Еўфрасінню Полацкую (~ 1110-1173), адну з найвыдатнейшых асоб ва Усходняй Еўропе XIi стагоддзя

Юхо Я. А. За вольнасць нашу і вашу
Пра Тадэвуша Касцюшку (1746-1817), выдатнага палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай

Грыцкевіч В. П. Адысея наваградскай лекаркі
Пра Саламею Русецкую, знакамітую лекарку і падарожніцу XVIII стагоддзя

Процька Т. С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі
Пра Кароля Чаховіча (1832-1902), таленавітага вучонага-фізіка

Казбярук У. М. Светлай волі зычны звон
Пра Алеся Гаруна (1887-1920), рэвалюцыянера і паэта, чалавека трагічнага лёсу

Кахаиоўскі Г. А. Руплівец нашай старасветчыны
Пра Яўстаха Тышкевіча (1814-1873), заснавальніка беларускай археалогіі і краязнаўства

Рыхтуюцца да выдання:

Бельскі А. М., Ткачоў М. А. Вялікае мастацтва артылерыі
Пра Казіміра Семяновіча (~1600-~1651), вынаходніка шматступеневай ракеты

Гусак А. А. Практычная механіка і «Мёртвыя душы»
Пра Мікалая Ястрэбскага (1808-1874), вучонага, інжынера-мостабудаўніка, таленавітага літаратара

Ялугін Э. В. Напачатку было слова
Пра Пятра Мсціслаўца, паслядоўніка Ф. Скарыны, аднаго з маскоўскіх першадрукароў

Піліпчук А. Я. Ланцэтнік — «залатая рыбка»
Пра Аляксандра Кавалеўскага (1840-1901), славутага біёлага, чые працы атрымалі сусветнае прызнанне

Арлоў У. А. Прысуд выканаў невядомы
Пра Ігната Грынявіцкага (1856-1881), рэвалюцыянера-нарадавольца, які выканаў смяротны прысуд Аляксандру II

Майсяёнак А. Г. Народны лекар з Браслава
Пра Станіслава Нарбута (1853-1926), які ўсё жыццё прысвяціў служэнню свайму народу

Саверчанка І. В. Канцлер Вялікага княства
Пра Льва Сапегу (1558-1633), славутага палітычнага дзеяча, рэдактара Статута 1588 года

Каўка А. К. Вястун нашаніўскае пары
Пра Івана Луцкевіча (1881-1919), аднаго з заснавальнікаў першай палітычнай партыі ў Беларусі

Сагановіч Г. М. Айчыну сваю баронячы...
Пра Канстанціна Астрожскага (1460-1530), славутага ваяводу, гетмана Вялікага княства Літоўскага

Дабравольскі У. А. Да ісціны — найпрасцейшым шляхам
Пра Васіля Ермакова (1845-1922), вядомага матэматыка, заслужанага прафесара Кіеўскага універсітэта

На жаль, у вольным продажы кнігі серыі «Нашы славутыя землякі» амаль адсутнічаюць, бо кнігагандлёвыя арганізацыі заказваюць іх неахвотна. Таму, каб не прапусціць чарговага выпуску гэтай серыі, лепш за ўсё аформіць папярэдні заказ. Для гэтага Вы зайдзіце ў найбліжэйшую кнігарню і, карыстаючыся тэматычным планам выдавецтва “Навука і тэхніка” (ён прыходзіць у кнігарні штогод звычайна у сакавіку), запоўніце паштоўку на тое выданне, якое Вас зацікавіла. Пра выхад у свет заказанай кнігі і магчымасць набыцця яе кнігары паведамяць Вам, прыслаўшы пакінутую Вамі паштоўку.

Чытайце самі і заахвочвайце сваіх блізкіх і знаёмых чытаць кніжкі серыі «Нашы славутыя землякі». З іх Вы даведаецеся шмат цікавага і раней невядомага пра нашых знакамітых суайчыннікаў, пра слаўную і трагічную гісторыю Беларусі.